Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 19 (518) | Субота, 10 мая 1941 года | Цана 20 кап.



Іосіф Вісарыёнавіч Сталін. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 6 мая 1941 года таварыш **І. В. Сталін** назначан Старшынёй Совета Народных Камісараў СССР.

Фотапартрэт Ф. Кіслова.

Задачы абароннай літаратуры

Учора пачала сваю работу акруговая нарада чырвонаармейскіх пісьменнікаў і паэтаў Заходняй Асобай Ваеннай Акругі. Скліканая па ініцыятыве Упраўлення палітычнай прапаганды ЗахАВА і абароннай камісіі ССП БССР, нарада павінна адыграць і адыграе важную ролю ў справе развіцця літаратуры на абаронную тэму, узняцця ідэйна-мастацкай вартасці абароннай літаратуры, павышэння чырвонаармейскімі пісьменнікамі і паэтамі свайго майстэрства, стварэння абароннай літаратуры, вартай нашай герайчнай Чырвонай Арміі, нашага магутнага совецкага народа.

Комуністычная партыя, правадыр народаў СССР і ўсіх працоўных І. В. Сталін вучаць наш народ быць заўсёды ў мабілізацыйнай гатоўнасці. Сучасная міжнародная абстаноўка надзвычай напружаная, мажлівы ўсялякія нечаканасці. Мы павінны быць гатовымі ў любую хвіліну стаць на абарону першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы — бацькаўшчыны працоўных усяго свету. І калі неразумныя ворагі паспрабуюць пайсці на нас вайной, яны будуць разбіты на іх-жа тэрыторыі.

Чырвонаармейскія пісьменнікі і паэты, усе пісьменнікі Совецкага Саюза павінны дапамагаць нашай партыі і ўраду, совецкаму народу мацаваць магутнасць соцыялістычнай дзяржавы. Самая перадавая і самая рэволюцыйная ў свеце совецкая літаратура павінна дапамагаць комуністычнай партыі выхоўваць у байцу, камандзіру і палітработніку волевасць, адвагу, храбрасць, геройства і адданасць вялікай справе Леніна — Сталіна, справе совецкага народа.

Пісьменнікі Совецкага Саюза многа зрабілі для таго, каб даць чытачу мастацкія кнігі аб геройчным мінулым і сучасным нашага совецкага народа, але яшчэ больш трэба зрабіць, каб задаволіць узросшыя запатрабаванні чытачоў самай перадавой, самай рэволюцыйнай і самай магутнай у свеце Чырвонай Арміі. Байцы, камандзіры і палітработнікі, увесь совецкі народ чакаюць ад пісьменнікаў твораў вялікай мастацкай сілы і праўды аб геніяльных стратэгах рэволюцыі — Леніне і Сталіне. Правадыры народаў СССР і ўсіх працоўных Ленін і Сталін стварылі Чырвоную Армію, выхавалі і закалілі яе ў шматлікіх баях з ворагамі совецкага народа.

Совецкі народ, байцы, камандзіры і палітработнікі чакаюць ад пісьменнікаў твораў аб палкаводцах Варашылаве, Тімашэнку, Будзённым, аб героях баёў ля Халхін-Гола, з фінскай белагвардзейшчынай, на якіх-бы выхоўваліся маладыя байцы, як весці барацьбу і перамагаць.

Совецкая літаратура стварыла шмат цікавых твораў аб выдатных палкаводцах: Фрунзе, Орджанікідзе, Кіраве, аб легендарных героях: Чапаеве, Шчорсе, Пархоменку, але тэма грамадзянскай вайны таксама яшчэ цалкам не вычарпана. Ёсць яшчэ многа матэрыялаў, да якіх пісьменнікі не дакраналіся.

Нарада чырвонаармейскіх пісьменнікаў і паэтаў сабралася ў момант, калі капіталістычны свет ахоплен другой імперыялістычнай вайной, якая нясе незлічоныя бядоты і пакуты шырокім працоўным масам. Толькі Совецкі Саюз, дзякуючы мудрай сталінскай палітыцы міру і ўмацавання безапаснасці нашай радзімы, стаіць па-за вайной. Краіна соцыялізма прадаўжае будаваць новае жыццё, імя якому — комунізм. Наша краіна, у якой перамагла ленінска-сталінская ідэалогія братэрства і дружбы народаў СССР, з кожным днём расце і мацнее; з кожным днём паляпшаецца дабрабыт шырокіх працоўных мас.

Правадзімая па ўказаннях партыі і ўрада перабудова метадаў баявой падрыхтоўкі і выхавання войск патрабуе ад чырвонаармейскіх пісьменнікаў і паэтаў, каб яны мастацкімі сродкамі, мастацкім словам дапамагалі камандаванню ў гэтай пачэснай і адказнай справе.

Чырвонаармейскія пісьменнікі і паэты, усе совецкія пісьменнікі павінны глыбей вывучаць сучасны ваенны вопыт, творча асмысліваць яго з тым, каб ствараць такія творы, якія-б дапамагалі нашаму народу ў справе ўмацавання ваеннай магутнасці соцыялістычнай дзяржавы.

Выпаўняючы ўказанні партыі і ўрада аб перабудове баявой падрыхтоўкі войск, Герой і маршал Совецкага Саюза таварыш Тімашэнка патрабуе «вучыць толькі таму, што патрэбна на вайне, і толькі так, як робіцца на вайне».

«Вопыт другой сусветнай імперыялістычнай вайны паказвае, што ў ваенным мастацтве адбываюцца вялікія зрухі. Прымяненне новых сродкаў узброенай барацьбы ў спалучэнні з удасканаленнем існаваўшых раней мяняе ўстанавіўшыяся разуменні аб спосабах вядзення вайны. Масавае выкарыстанне на палях сражэнняў танкаў і пікіруючых бамбардыроўшчыкаў у камбінацыі з матарызаванымі і матацыклетнымі войскамі, у цесным узаемадзеянні з паветранымі дэсантамі павысіла тэмпы сучасных ваенных аперацый. Стала быць, да камандзіра—поўнаўладнага кіраўніка войск—цяпер прад'яўляюцца непараўнальна больш высокія патрабаванні». («Праўда»).

Непараўнальна больш высокія патрабаванні прад'яўляюцца цяпер і да чырвонаармейскага пісьменніка, які не толькі павінен дасканала ведаць ваеннае мастацтва, але і авалодаць майстэрствам пісьменніка, павысіць свой ідэйны ўзровень, бо без гэтага нельга стварыць поўнацэнны ідэйна-мастацкі твор, які-б дапамагаў мацаваць магутнасць соцыялістычнай дзяржавы.

Скліканая Упраўленнем палітычнай прапаганды ЗахАВА нарада заклікана дапамагчы творчаму росту чырвонаармейскіх пісьменнікаў і паэтаў. Пажадаем ёй плодатворнай работы! Пажадаем чырвонаармейскім пісьменнікам і паэтам стварэння такіх твораў, якія-б спрыялі далейшаму ўмацаванню магутнасці ўзброеных сіл нашай соцыялістычнай радзімы!

Максім Танк

Ткачам

Каго не хвалюеш ты,
песня
фабрычных сірэн і матораў!
Па сонечных цэхах іду я.
Хай славіцца
праца ткачоў!

Я ўгледзеў стаханаўцаў, моладзь —
з кім разам у бітвы хадзілі,
з кім волю віталі і танкі,
і зоры
на шлемах байцоў.

Вясёлкамі ззяюць на пражы
ўсе колеры нашай радзімы:
чырвань Крэмлёўскага сцяга
і Арктыкі снежная бель,
глыбокі блакіт акіяпаў,
зелень стэповых прастораў,
зелень наднёманскіх пушчаў
і спелае
золата ніў.

З любоўю ткуцца палотны
з бавоўны, лёну і шоўку,
якімі атуляцца ўзорна
мільёны шчаслівых дзяцей,
дзявочыя стройныя грудзі
і хлопцаў шырокія плечы;
палотны, якімі засцелем
святочныя
нашы сталы.

Дык тчыце-ж, ткачы, летуценні,
ва ўзорах шляхі самалётаў,
цудоўныя казкі і песні,
ўраджаяў калгасных плады!
Для Сталінскіх
слаўных паходаў,
Для новых Кастрычнікаў, Маяў,
для новых совецкіх рэспублік
чырвоныя тчыце сцягі!

Беласток, 28.IV.41.

Акруговая нарада чырвонаармейскіх пісьменнікаў

Чырвоная Армія — вялікая баявая школа. Штодзённа і штогадзінна выхоўвае яна ў байцах самаадданасць, адвагу, мужнасць. У гэтай школе совецкія воіны навучаюцца майстэрству перамогі, робяцца меткімі стралкамі, выдатнымі знаўцамі баявой тэхнікі. У гэтай школе непарыўна павышаецца іх палітычны ўзровень. Адначасова Чырвоная Армія — школа талентаў. Яна прывівае байцам любоў да песні, да музыкі, да мастацкага слова, да выяўленчага мастацтва. І вядома, усё гэта ва ўмовах Чырвонай Арміі падпарадкавана баявой падрыхтоўцы, той велізарнай перабудове ў галіне ваеннага навучання, якая зараз праводзіцца ў часцях нашай арміі.

Адкрыўшаяся 9 мая ўвечары ў Мінскім акруговым Доме Чырвонай Арміі імя К. Е. Варашылава творчая нарада пісьменнікаў і паэтаў Заходняй Асобай Ваеннай Акругі яшчэ раз пацвярджае, якое вялікае значэнне надаецца ва ўмовах арміі дзейснаму мастацкаму слову. Для ўдзелу ў нарадзе з розных часцей акругі прыбылі байцы, камандзіры, палітычныя работнікі, якія з вялікім поспехам сумяшчаюць напружаную ваенную вучобу з работай у галіне мастацкага слова. Сярод удзельнікаў нарады старшы палітрук тав. Чуксін — празаік, ён напісаў дзве аповесці, прысвечаныя сёлешняму дню Чырвонай Арміі; нам. палітрука тав. Валкадаеў — паэт-валжанін, у сваіх вершах ён ярка і вобразна паказвае поспехі ваеннай вучобы сваіх таварышоў, вельмі тонка і метка рысуе псіхалагічныя партрэты сваіх герояў. На нараду прыехалі малодшы сяржант тав. Маручэк, малодшы лейтэнант тав. Хадыка, нам. палітрука тав. Семяніхін і многія іншыя.

Нарада працоўжыцца тры дні. На парадку дня нарады даклад члена Ваеннага Совета акругі, карпуснога камісара тав. Фаміных, даклады аб творчасці чырвонаармейскіх пісьменнікаў і выступленні армейскіх пісьменнікаў са сваімі творамі.

9 мая, пасля ўступнага слова дывізіённага камісара тав. Лесцева, з цікавым дакладам: «Задачы чырвонаармейскіх пісьменнікаў у барацьбе за перабудову баявой падрыхтоўкі войск» выступіў тав. Фаміных. Поўнакроўна паказаць баявы вопыт, накоплены ў Чырвонай Арміі, і тую велізарную работу, якая праводзіцца ў часцях па набліжэнню ўсёй вучобы да сапраўднай ваеннай абстаноўкі, — гэта першачарговая задача армейскага пісьменніка. Больш матэрыялаў аб сучаснасці! Вучыцца на геройчных узорах. Выхоўваць мужнасць, храбрасць, волю да перамогі. Самім пісьменнікам больш і лепш вучыцца на класічных прыкладах вялікіх майстроў мастацкага слова, каб быць здольнымі стварыць творы, вартыя нашай радзімы, нашай арміі.

* * *

8 мая ў клубе газеты «Красноармейская правда» быў арганізаван вялікі вечар ваеннай літаратуры, прысвечаны нарадзе. З чыткай сваіх твораў выступілі Н. Аляксееў, П. Валкадаеў, Т. Маручэк, Е. Садоўскі.

Да лермантаўскіх дзён

Да 100-годдзя з дня гібелі вялікага рускага паэта М. Ю. Лермантава, якое споўніцца 27 ліпеня г. г., Беластоцкі яўрэйскі драматычны тэатр падрыхтаваў пастаноўку п'есы Лермантава «Іспанцы» (пераклад А. Кушнірова).

П'есу паставіў мастацкі кіраўнік тэатра М. А. Норвід, аформіў мастак-ордэнаносец Л. Кроль, музыку да спектакля напісаў кампазітар І. Шаевіч.

Акрамя Беластока, спектакль «Іспанцы» тэатр пакажа працоўным Магілёва, Віцебска, Смаленска, куды ён выязджае ў чэрвені на чатырохмесячныя гастролі.

Беласток. (Наш кар.).

Партыйнае жыццё

Дзейсна рыхтавацца да 25-годдзя Вялікага Кастрычніка

Справаздачна-выбарчы сход партарганізацыі ССП БССР

7 мая адбыўся справаздачна-выбарчы сход партарганізацыі ССП БССР. Сакратар партарганізацыі тав. Модэль падрабязна спыніўся на тых задачах, якія стаялі перад партарганізацыяй Саюза пісьменнікаў БССР у сувязі з рашэннямі XVIII партыйнага з'езда і XVIII партыйнай канферэнцыі. Ён адзначыў, што беларуская совецкая літаратура з году ў год расла і мацнела. За апошні год былі выданы такія кнігі, як «Ад сэрца» народнага паэта БССР, лаўрэата Сталінскай прэміі Янкі Купалы, «Пад сталінскім сонцам» народнага паэта БССР Якуба Коласа, «Сустрэчы» М. Лынькова, «Шляхамі баравымі» П. Броўкі, надрукаваны такія каштоўныя творы, як «Салаўі святога Палікара» Р. Мурашкі, «У матрацнай магіле» акадэміка С. Вальфсона, «Пампей Шчупак» А. Стаховіча, «Паўстанне» і «Магістральны канал» М. Паслядовіча, аповесць Кузьмы Чорнага «Лізіна каханне», калектыўнае пісьмо таварышу Сталіну, напісанае Максімам Танкам, Філіпам Пестраком, М. Машарай, Натальяй Арсеньевай і М. Клімковічам, паэма «Хлопцы апошняй вайны» і рад вершаў А. Куляшова, рад новых вершаў П. Глебкі. Пастаўлены п'есы: П. Глебкі—«Над Бярозай-ракой», К. Чорнага—«Ірынка». Якуб Колас пачаў друкаваць вялікую паэму «На «крэсах усходніх», якая па сваёй якасці стаіць на ўзроўні яго класічнай паэмы «Новая зямля». І. Гурскі напісаў новую п'есу «Свае людзі», якая прынята двума беларускімі тэатрамі. П'еса лаўрэата Сталінскай прэміі Кандрата Крапівы «Хто смяецца апошнім» ідзе ў дзесятках тэатраў Совецкага Саюза. П'еса В. Вольскага ідзе ў Мінску і ў Маскве. Рад драматургаў стварылі лібрэта опер, якія атрымалі высокую ацэнку ў часе дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. Выйшлі кнігі пісьменнікаў заходніх абласцей Беларусі—М. Танка, Ф. Пестрака, Ніны Тарас; выйшаў рад кніг яўрэйскіх пісьменнікаў БССР.

Усё гэта сведчыць аб творчай актыўнасці совецкіх пісьменнікаў БССР, аб іх росце, аб кансалідацыі пісьменніцкіх кадраў вакол задач, пастаўленых партыяй перад совецкай літаратурай. Саюз совецкіх пісьменнікаў і партарганізацыя ў справаздачным годзе ў цэнтры сваёй увагі ставілі творчыя пытанні літаратуры. На партыйных сходах былі разгледжаны і абмеркаваны паэма Эдзі Агняцвет «Валерый Чкалаў», аповесць А. Стаховіча, лібрэта новай оперы «Кастусь Каліноўскі», калектыўная паэма «З тваім імем у сэрцы». Былі праведзены падагульняючыя канферэнцыі па прозе і паэзіі за 1940 год. Усе гэтыя абмеркаванні далі карысць аўтарам твораў, паказалі рост нашай крытыкі, мабілізавалі пісьменнікаў на барацьбу за якасць.

За апошні час ажывілася работа секцый абароннай, дзіцячай літаратуры, паэтычнай секцыі. Слабай застаецца работа секцый празаікаў і драматургаў. Некалькі палепшылася работа з маладымі пісьменнікамі: наладзіўся іх учот, палепшылася якасць кансультацыі, добра прайшлі курсы маладых пісьменнікаў.

Аднак і ў гэтай творчай рабоце ёсць шмат недахопаў. Перш-на-перш вялікім недахопам з'яўляецца тое, што беларуская літаратура ўсё яшчэ адстае ад сучаснасці, асабліва ў галіне адлюстравання работы і людзей рабочага класа, жыцця нашага горада. Зусім мала зроблена ў галіне адлюстравання таго вялікага ўсенароднага руху па асушцы балотаў, які цяпер разгарнуўся на Беларусі. Мала, амаль зусім няма твораў, якія адлюстроўваюць Кастрычнік на Беларусі, эпоху грамадзянскай вайны, паказваюць той актыўны ўдзел у стварэнні і абароне беларускай совецкай дзяржаўнасці, які прымалі ў гэтым правадыры нашай партыі. Гэтыя задачы пастаўлены партарганізацыяй перад пісьменнікамі БССР у сувязі з падрыхтоўкай да 25-годдзя Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Недастаткова актыўна працуе секцыя яўрэйскіх пісьменнікаў (адказны сакратар тав. Фінкель), і партыйная арганізацыя недастаткова вывучала прычыны яе слабай работы, нездавальняюча кіравала ёю. Былі буйныя недахопы і ў кіраванні польскімі пісьменнікамі БССР. У апошні час адчувалася некаторая заспакоенасць і недастатковая палітычная пільнасць як сярод пісьменнікаў-комуністаў, так і сярод усёй масы пісьменнікаў. Праўда, асобныя шкодныя творы былі своечасова ўскрыты і раскрытыкаваны партыйнай арганізацыяй. Але поруч з гэтым было ў партыйнай арганізацыі яўнае забыццё на тое, што мы знаходзімся ў капіталістычным акружэнні і вораг можа скарыстаць і скарыстоўвае ўсякую шчылінку, усякі выпадак ратазейства, каб праводзіць сваю брудную работу.

Палітычнае выхаванне пісьменнікаў, партыйная вучоба комуністаў і беспартыйных таварышоў за апошні год некалькі ўзмацнілася: гаркомам партыі быў створан марксісцка-ленінскі універсітэт, які наведвае асноўны актыў пісьменнікаў; добра працаваў гурток па вывучэнню гісторыі партыі, які наведвалі комсамольцы, кандыдаты партыі і беспартыйныя пісьменнікі; былі праведзены дзве тэарэтычныя гутаркі па кнігах В. І. Леніна і тры гутаркі па біяграфіі таварыша Сталіна. Аднак і ў гэтым сэнсе ёсць яшчэ шмат недахопаў: рад пісьменнікаў дрэнна наведваюць універсітэт; не было патрэбнай праверкі таварышоў, якія індывідуальна займаюцца вывучэннем гісторыі партыі.

Зусім дрэнным было кіраўніцтва комсамолам і іншымі грамадскімі арганізацыямі. Слабай была агітацыйна-масавая работа сярод работнікаў апарата ССП, у выніку чаго ёсць яшчэ парушэнні працоўнай дысцыпліны, неашчадныя адносіны да фінансаў і г. д. Застаецца дрэннай работа Літфонда, які з года ў год не выконвае сваіх вытворчых планаў і прыносіць сістэматычна дэфіцыт дзяржаве. Да апошняга часу дрэнна працавала наша выдавецтва, не было ў ім гаспадарскіх клопатаў аб своечасовым выхадзе журнала, аб своечасовай дастаўцы яго падпісчыкам. У апошні час і па гэтай лініі прыняты меры. Праўленне ССП БССР зацвердзіла новы склад рэдкалегій журналаў «Полымя рэволюцыі» і «Штэрн» і трэба думаць, што справа з нашымі выданнямі значна палепшыцца.

Партыйная арганізацыя Саюза совецкіх пісьменнікаў за гэты год значна вырасла: у члены партыі прыняты тт. Куляшоў, Рудзько, Броўка, у кандыдаты партыі тт. Крапіва і Глебка. Партыйная арганізацыя аб'ядноўвае зараз рад перадавых творчых работнікаў літаратуры, узняўся яе аўтарытэт, узнялася перадавая роля пісьменнікаў-комуністаў.

Тав. Модэль спыняецца на тых задачах, якія стаяць перад партарганізацыяй у сувязі з 25-годдзем Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі і чарговымі мерапрыемствамі партыі і ўрада.

У спрэчках па дакладу тав. Модэля выступіла 12 чалавек: тт. Лынькоў, Крапіва, Клімковіч, Агняцвет, Стаховіч, Броўка, Глебка, Мазо, Гурскі, прадстаўнік гаркома партыі тав. Вінаградаў і інш. Усе выступаўшыя адзначылі, што партарганізацыя Саюза пісьменнікаў за апошнія годы правяла вялікую работу, зжыла той адрыў ад беспартыйных пісьменнікаў, які быў раней, узмацніла сваё кіраўніцтва творчай работай, палепшыла палітычнае выхаванне пісьменнікаў. Аднак, усе выступаўшыя ўказвалі, што заспакайвацца на дасягнутым было-б шкодна для справы. Тт. Глебка, Клімковіч, Гурскі і рад іншых таварышоў гаварылі аб недахопах у рабоце з маладымі пісьменнікамі, у выніку чаго прыток новых пісьменнікаў занадта марудны. Кадры маладых пісьменнікаў ёсць, толькі ў саюзе іх мала ведаюць. Днямі паэтычная секцыя зрабіла вечар паэта А. Бурдзеля і аказалася, што тав. Бурдзель мае свой паэтычны голас, піша добрыя і патрэбныя краіне вершы. Дрэнна працавалі і з Б. Зубцом, які з'яўляецца здольным пісьменнікам, працуе тэхнікам і піша на вытворчыя тэмы. Нашы журналы і газета мала друкуюць маладых пісьменнікаў, а частка крытыкаў пад сцягам змагання за якасць работы адбівае ў маладых пісьменнікаў усякае жаданне працаваць, падыходзячы да іх твораў без уліку як росту пісьменніка так і неабходнасці работы з ім рэдактара. Зусім нязначна пашырана ў нас творчая сувязь і дапамога маладым пісьменнікам з боку старэйшага пакалення, што заўсёды было самай плодатворнай формай выхавання маладых кадраў. Няма ў Саюзе пісьменнікаў практычнай магчымасці дапамагчы маладым таленавітым пісьменнікам, якім патрэбна тэарэтычная падрыхтоўка, кнігамі, хаця-б у парадку пасылкі бібліятэчкі-перасоўкі.

Шмат увагі ў спрэчках было аддадзена партыйнай вучобе. Тт. Агняцвет, Броўка, Гурскі гаварылі аб тым, што пры ўсім станоўчым, што дае пісьменнікам марксісцка-ленінскі універсітэт, ён мае і недахопы. Частка лекцый у ім была на зусім нізкім тэарэтычным узроўні, выкладалася суха і нецікава. Не было лекцый па гісторыі Беларусі, па асобных творах Маркса і Энгельса. Прыстасаванне праграмы да агульнага ўзроўню і прафесіянальнай спецыфікі аудыторыі ў належнай меры не праводзілася, а часамі ў падборы лекцый наогул не было ніякай сістэмы. Універсітэт не прымяняў актыўных метадаў прапрацоўкі матэрыялу, а абмяжоўваўся толькі лекцыямі, таму пісьменнікі за апошні час аслабілі самастойную работу над першакрыніцамі. Тав. Вінаградаў асабліва падкрэсліў, што праверка ходу вывучэння гісторыі ВКП(б) у партарганізацыі не была наладжана і шмат пісьменнікаў наогул не павышае свайго тэарэтычнага ўзроўню.

Тав. Лынькоў і іншыя гаварылі аб неабходнасці большай сувязі пісьменніка з жыццём. Яны прыводзілі прыклады, калі нават «паважаныя» і таленавітыя пісьменнікі цярпелі няўдачы з-за таго, што замыкаліся ад жыцця ў сценах свайго кабінета. У прыватнасці, таварышы звярталі ўвагу на неабходнасць бываць на заводах, на новабудоўлях, на асушцы балотаў, больш аператыўна ўключацца ў практыку соцыялістычнага будаўніцтва, да чаго нас заклікаюць ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б.

Тав. Крапіва гаварыў аб неабходнасці больш глыбокага і ўсебаковага азнаямлення з тымі творамі, якія ставяцца на абмеркаванне праўлення саюза і партарганізацыі, каб гэтыя абмеркаванні не праходзілі фармальна, а давалі сапраўдную карысць пісьменніку. Ён звярнуў асаблівую ўвагу на тое, што нашы яўрэйскія пісьменнікі за апошні час не стварылі ніводнай больш-менш значнай рэчы, якая-б выйшла за межы яўрэйскай літаратуры БССР. Гэта тлумачыцца некаторай замкнутасцю яўрэйскай секцыі і недастатковай грамадскай актыўнасцю яўрэйскіх пісьменнікаў.

Тав. Кацовіч звярнуў увагу пісьменнікаў на неабходнасць больш шырокага і актыўнага ўключэння ў кінодраматургію, павышэння ўдзелу Саюза пісьменнікаў і яго праўлення ў стварэнні добрых беларускіх кінокарцін.

Тав. Мазо гаварыў аб недахопах работы комсамольскай арганізацыі, аб фактычнай бяздзейнасці сакратара комсамольскай арганізацыі тав. Кучара, аб буйных недахопах у рабоце Літфонда, якім зараз не займаецца ні Саюз пісьменнікаў, ні Упраўленне па справах мастацтваў.

Сход прызнаў работу сакратара партарганізацыі тав. Модэля здавальняючай і прыняў рэзалюцыю, якая вызначае чарговыя практычныя задачы партарганізацыі.

Сход выбраў бюро партарганізацыі ў складзе тт. Лынькова, Модэля, Гурскага, Мазо і Агняцвет. Сакратаром партарганізацыі зноў выбран тав. Модэль.

М. К.

Нацыянальны рух і беларуская літаратура

Франц Багушэвіч

★ М. Смолкін ★

Як гэта ні дзіўна, але дасюль пры характарыстыцы гісторыі беларускай літаратуры ніяк не ўлічваецца рашаючы ўплыў на літаратуру нацыянальнага руху. Між тым, самы факт узнікнення новай беларускай літаратуры адбыўся дзякуючы прабуджэнню нацыянальнай самасвядомасці, выражэннем якой і з'явілася наша літаратура.

В. І. Ленін добра разумеў буржуазны характар беларускага нацыянальнага руху. Тым не менш, ён лічыў абавязкам сацыял-дэмакратыі падтрымліваць нацыянальны рух беларусаў, таму што бачыў у ім «абарону дэмакратыі, роднай мовы, палітычнай свабоды супроць прыгнятаючых нацый, супроць сярэдневякоўя» (Ленін, т. XIX, стар. 204).

Беларускі нацыянальны рух — вельмі складаная ў класавых адносінах з'ява. Пад адным нацыянальным сцягам аб'ядноўвалася буржуазная інтэлігенцыя і інтэлігенцыя народная. Платформай для аб'яднання была агульная нянавісць да каланізатарскай палітыкі самадзяржаўя. Але розныя класы мелі неаднолькавыя інтарэсы ў нацыянальным руху.

Указанне А. М. Горкага аб тым, каб песню «А хто там ідзе» растлумачвалі як нацыянальны гімн адраджаючыхся беларусаў, у сувязі з ідэалогіяй «Нашай нівы», трэба тлумачыць больш шырока — як неабходнасць разглядаць тэорыю беларускай літаратуры ў сувязі з тэорыяй барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

Расія,—пісаў Ленін,—стракатая ў нацыянальных адносінах краіна. Палітыка самадзяржаўя ў адносінах нярускіх народаў была наскрозь прасякнута чорнасоценным нацыяналізмам. Беларусь у гэтых адносінах не была выключэннем. Самадзяржаўе ўтульна яе той-ж «дзікай» Башкірыяй, якую трэба «асвоіць» і аднямецьць з-пад польскага ўплыву. Пасля паўстання 1863 года нацыянальны гнёт зрабіўся асабліва цяжкім.

Ні аб якім беларускім народзе, як этнаграфічна адрозным і ад польскага і ад рускага, пасля паўстання 1863 году нельга было ўжо і гаварыць. «Даказвалася,—пісаў рускі вучоны Пыпін,—не толькі тое, што край гэты рускі, але што заходнеруская альбо беларуская народнасць навогул не існуе...» (А. Н. Пыпін — «Гісторыя рускай этнаграфіі», т. IV, стар. 3—4).

У запісцы папячыцеля Віленскай вучэбнай акругі Карнілава літаральна так і было сказана: «У губерніях-жа Віленскай, Гродзенскай і Мінскай большая частка сельскага насельніцтва гаворыць выключна беларускім: таму і народныя вучылішчы ў гэтых мясцовасцях павінны быць чыста рускімі». («Матэрыялы», т. II, стар. 555).

Гэткая была логіка расійскага самадзяржаўя ў адносінах да беларусаў, «самага забітага народа ў Расіі» (М. Горкі).

Натуральна, што беларускі народ павінен быў адказаць на гэты бяспрыкладны сацыяльны і нацыянальны гнёт рашучым пратэстам. Народу былі аднолькава нянавісны і польскія і рускія паны. У часе паўстання 1863 года беларускія сяляне грамілі панскія маёнткі і пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага адстойвалі свае нацыянальныя інтарэсы.

Нацыянальныя ідэі ў Беларусі пасля 1863 года развіваліся пад знакам народніцкай ідэалогіі. Правадыр беларускага паўстанцкага руху К. Каліноўскі таксама належаў да народнікаў радыкальнага напрамку. На яго погляды велізарны ўплыў меў Герцэн з «Колоколом», з якім К. Каліноўскі пазнаёміўся, калі быў студэнтам юрыдычнага факультэта Пецярбургскага універсітэта. Яго адозвы «Яські гаспадара з-пад Вільні», надрукаваныя ў падпольнай друкарні на беларускай мове, абуджалі нацыянальную самасвядомасць народа, нагадвалі аб зняважаным нацыянальным гонары.

З сярэдзіны 80-х год прыкметна ажыўляецца работа нацыянальных беларускіх гурткоў, праграма якіх спалучала народніцкія ідэі (інтэлігенцыя і народ, абшчыннае землекарыстанне, зачаткі кааперацыі) з нацыянальна-вызваленчымі лозунгамі. Работа гэтых гурткоў насіла ярка выражаны культурніцкі характар: выданне літаратуры на беларускай мове. Работа гэтых гурткоў канцэнтрыравалася пераважна ў універсітэцкіх цэнтрах (Пецярбург, Юр'еў і іншыя гарады), дзе вучыліся выхадцы з Беларусі.

Выключна вялікі ўплыў на развіццё беларускага нацыянальнага руху і на фарміраванне навейшай беларускай літаратуры аказаў Франц Багушэвіч. Ён па праву лічыцца першым нашым нацыянальным паэтам у поўным сэнсе гэтага слова. Яму належыць гонар сфармуліравання ідэі нацыянальнага адраджэння беларусаў.

Па свайму паходжанню Ф. Багушэвіч быў сынам дробнага шляхціча Віленскай губерні. Да польскага паўстання 1863 года Ф. Багушэвіч займаўся на фізіка-матэматычным факультэце Пецярбургскага універсітэта. Незадоўга да паўстання выключаны з універсітэта Ф. Багушэвіч прыехаў на радзіму ў Беларусь, каб прыняць удзел у ім. Вызваленчыя ідэі паўстання і пачаўшыйся рух народнікаў накіравалі яго далейшую работу.

Пасля сканчэння юрыдычнага ліцэя ў Вільні (1868 год) Ф. Багушэвіч доўгі час працуе павятовым судзёй на Украіне і ў Беларусі, блізка вывучае народнае жыццё. Народніцкая ідэя аб правах чалавека і грамадзяніна робіцца ў Ф. Багушэвіча ідэяй нацыянальнага вызвалення беларускага народа. Абыходзячы забароны цэнзуры, ён выдае (схаваўшыся пад псеўданімам Мацея Бурачка) у 1891 годзе кнігу вершаў «Дудка беларуская», а ў 1894 годзе ў Пазнані выходзіць яго-ж (псеўданім Сымон Рэўка) другі вершаваны зборнік — «Смык беларускі».

Самы факт паяўлення вершаў на забароненай і ганімай беларускай мове быў вялікай падзеяй для нацыянальнай культуры. Ф. Багушэвіч першы загаварыў ад імя галоднага і бяспраўнага беларускага сялянства і адрасаваў свой верш яму, — у гэтым глыбокі дэмакратычны сэнс яго дзейнасці.

Пытанне аб літаратурных уплывах на Ф. Багушэвіча дасюль не даследавана. Прыблізна можна ўказаць лініі, якія ідуць з польскай (Сыракомля, Канапніцкая) і рускай літаратуры (Някрасаў і паэты-народнікі).

У «Прадмове» да кнігі сваіх вершаў «Дудка беларуская» Ф. Багушэвіч, звяртаючыся да беларускага народа, дае абгрунтаванне ідэі адраджэння беларусаў. Гэта «Прадмова» адыграла вялікую ролю ў развіцці нацыянальнага руху і стала затым адначасова і маніфестам і праграмай для дзейнасці інтэлігенцыі, якая працавала ў «Нашай ніве».

Якія довады ў абарону свайго тэзісу аб самабытнасці беларускага народа высоўвае Ф. Багушэвіч у сваёй «Прадмове»?

Перш за ўсё, ён звяртаецца да гістарычнага мінулага, калі Беларусь, аб'яднаная з Літвой, складала адну Літоўска-Беларускую дзяржаву, а беларуская мова была дзяржаўнай мовай. Гэта быў час адноснага росквіту беларускай пісьменнасці і натуральна, што позіркі нацыянальнай інтэлігенцыі звярталіся сюды.

«Ужо больш, як пяцьсот гадоў таму, да панавання князя Вітэнэса на Літве, Беларусь разам з Літвой баранілася ад крыжацкіх напасцей і шмат местаў, як Полацк, прызнавалі над сабой панаванне князёў літоўскіх, а пасля Вітэнэса літоўскі князь Гэдымін злучыў зусім Беларусь з Літвой у адно сільнае каралеўства і адваяваў шмат зямель ад крыжакоў і ад другіх суседзяў. Літва пяцьсот дваццаць гадоў таму назад ужо была ад Балтыцкага мора аж да Чорнага... а ў сярэдзіне Літвы, як тое зярно ў гарэсе, была наша зямліца — «Беларусь»! (Ф. Багушэвіч, «Прадмова»).

Перад вачыма Ф. Багушэвіча адбывалася абуджэнне прыгнечаных славянскіх нацый — іх барацьба за нацыянальную незалежнасць. Палякі, харваты, чэхі, балгары ўжо к гэтаму часу («Дудка беларуская» выйшла ў 1891 годзе) заявілі аб сваіх правах.

«З пачуццём вялікай горычы за свой народ, за яго інтэлігенцыю Ф. Багушэвіч ускліквае: «Божа-ж, мой божа! што-ж мы за такія бязродныя? Якая-ж маленькая Булгарыя — са жменю таго народу, — якіясьць харваты, чэхі, маларусы і другія пабрацімцы нашыя і розныя чужыя маюць па-свойму пісаныя і друкаваныя ксёнжачкі і газеты, і пабожныя, і смешныя, і слёзныя, і гісторыйкі, і баечкі, і дзеткі іх чытаюць так, як і гавораць, а ў нас як-бы захацеў цыдульку ці да бацькі лісток напісаць па-свойму, дык можа-б і ў сваёй вёсцы людзі сказалі, што «піша па-мужыцку», і як дурня абсмяялі-б».

Якія-ж шляхі да нацыянальнага адраджэння ўказваў Ф. Багушэвіч?

У адрозненне ад ортадаксальнага народніцтва, адмаўляўшага падзел грамадства на класы, класавую дыферэнцыяцыю, Ф. Багушэвіч адрознівае паноў і мужыкоў у плане самага агульнага проціпастаўлення беднасці і багацця. Праўда, паняццем «пан» ён акрэсліў не толькі эканамічна ўладарных людзей, але і наогул інтэлігентаў, але вайстрыня сацыяльных супярэчнасцей не падмяняецца ім нацыянальнымі лозунгамі.

Ф. Багушэвіч гаворыць не толькі аб нацыянальным бяспраўі беларусаў, але і аб сацыяльным, уся яго паэзія пранікнута сацыяльна-нацыянальнымі матывамі.

Шлях будучага ўздыму нацыянальнага жыцця ўяўляўся Ф. Багушэвічам, як сумесная работа інтэлігентаў альбо, як ён гаварыў, «паноў» і мужыкоў. Адукаваная, цывілізаваная панюю працы і крыві народа інтэлігенцыя не павінна чурацца яго, а адукоўваць мужыка, паказваць яму шлях:

Не чураўся-б мужыцкай бядоты,
I падаў-бы руку мне, сляпому,
I давёў-бы мяне да дарогі;
Не блудзіў-бы і я сярод лому
I калючак, што раняць мне ногі...
(«Не чурайся»).

Інтэлігенцыя павінна аплаціць доўг свайму народу. Гэты народніцкі лозунг зноў высоўвае «Наша ніва» са спасылкамі на «Исторические письма» Лаўрова.

У поўным глыбокага сімвалічнага сэнсу вершы «Калыханка» Ф. Багушэвіч гаворыць аб двух тыпах інтэлігентаў і аб магчымых жыццёвых дарогах для мыслячых людзей. Так павялося ўжо пад уплывам неспрыяючых для развіцця нацыянальнай самасвядомасці гістарычных умоў, што большасць культурных людзей-беларусаў адмаўлялася ад сваёй радзімы і пераходзіла ў стан «лікуючых». Яны заставаліся сляпымі і глухімі да патрэб маці-радзімы.

Але інтэлігент можа і павінен быць другім. Паехаўшы на чужыну «за навукай», навучыўшыся і стаўшы «панам», такі чалавек не забывае сваёй краіны.

Галоўная, рухаючая сіла прагрэсу — інтэлігенцыя, крытычна-мыслячыя асобы,—сцвярджалі народнікі, і для Ф. Багушэвіча ўся задача заключалася ў тым, каб сабраць сілы інтэлігенцыі, аб'яднаць іх ідэяй нацыі, разбудзіць у інтэлігенцыі пачуццё нацыянальнай вартасці. Ф. Багушэвіч марыць аб сумленным інтэлігенту, які-б «за край быў умерці гатоў, каб не прагнуў айчызны чужых», «каб не здрадзіў за грошы свой люд» («Ахвяра»).

Адраджэнне беларускага народа ўяўлялася Ф. Багушэвічу, перш за ўсё, як развіццё нацыянальнай культуры. Асвета павінна стаць здабыткам не жменькі людзей, а ўсяго народа. Усе няшчасці мужыка, думаў Ф. Багушэвіч, заснаваны на яго цемры, некультурнасці. Калі-б народ прасвяціць, ён пачаў-бы адрозніваць прыяцеляў ад ворагаў і ўступіў-бы ў барацьбу з варожымі сіламі.

Праз асвету—да паляпшэння эканамічнага становішча народа,—у такім напрамку павінна ісці работа. Трэба клапатліва культывіраваць тыя адзнакі, у якіх заключаецца арыгінальны характар народа. Такой, самай важнай адзнакай нацыі, па думцы Ф. Багушэвіча, з'яўляецца мова. Таму ў выказваннях Ф. Багушэвіча, а пазней і ў праграме «Нашай нівы» вялікае месца адведзена беларускай мове.

«Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю, так, як той чалавек перад сканаңнем, катораму мову займе, а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце-ж мовы нашай беларускай, каб не ўмерлі». За гэтымі, некалькі наіўнымі, як гэта зараз можа паказацца, разважаннямі Ф. Багушэвіча крыецца глыбока прагрэсіўная тэндэнцыя культывіраваць родную мову, абуджаць у інтэлігенцыі цікавасць да мовы, на якой гавораць мільёны людзей.

З вялікай грамадзянскай мужнасцю адстойвае Ф. Багушэвіч беларускую мову ад шавіністычных нападак людзей «сваіх» і «чужых». «Мова нашая ёсць такая-ж людская і панская, як і французская, або нямецкая, або іншая мова».

У тым, што беларуская мова ў дні Ф. Багушэвіча перастала быць афіцыяльнай мовай культуры, вінавата «цяжкая доля»,—больш ясна ён не мог сказаць аб гэтым.

У вершы «Праўда», які нагадвае прыпчыты, тэма роднай мовы гучыць сумна і амаль безнадзейна:

Ой, божа-ж мой, божа, нашто-ж я радзіўся?
Ой, нашто-ж мне дана тая мова,
Як я не ўмею сказаць тое слова.

Калі Ф. Багушэвіч у «Прадмове» просіць не чурацца беларускай мовы, дык яго зварот адрасаван зноў-такі да інтэлігенцыі, таму што пераконваць народ не чурацца сваёй мовы не было неабходнасці.

К гонару Ф. Багушэвіча, трэба сказаць, што нацыянальныя настроі ніколі не прымаюць у яго войструю, усёахопліваючую форму, як гэта нярэдка бывае ў падобных выпадках. Нацыянальная барацьба ніколі не даходзіла ў яго да крайнасці і не мела характару самамэты. Нацыянальны гнёт для Ф. Багушэвіча быў следствам бяспраўнага становішча мужыка перад царскім законам. Сацыяльная накіраванасць паэзіі Ф. Багушэвіча ніколі не засланялася матывамі нацыянальнымі. У гэтым Ф. Багушэвічу пасля наследуюць Купала і Колас, Багдановіч і Бядуля, у якіх заўсёды была моцнай дэмакратычная аснова іх творчасці. Гэта сувязь з «глебай» і ўтрымлівала іх ад крайнасцей нацыяналізма.

Цярпімасць і павага да іншых нацый —гэты прынцып беражліва ахоўвае Ф. Багушэвіч, а ў адносінах да суседніх славянскіх народаў ён лічыць патрэбным больш блізкі кантакт (веданне славянскіх моў і г. д.). Але культурныя каштоўнасці, выпрацаваныя чалавецтвам, не павінны ператварацца ў доказ непатрэбнасці менш развітай культуры беларусаў. Культурныя дасягненні народаў павінны быць засвоены на нацыянальнай глебе, павінны падкрэсліваць і ўзмацняць нацыянальную культуру. А для таго, каб слабыя, пакуль яшчэ, парасткі нацыянальнай беларускай культуры не былі заглушаны, трэба перш за ўсё клапаціцца аб руху наперад сваёй мовы, сваёй кніжнай культуры. Гэткі сэнс разважанняў Ф. Багушэвіча аб беларускай культуры, аб кніжках, напісаных на роднай мове.

«Ці ўжо нам канешне толькі на чужой мове чытаць і пісаць можна? Яно добра, а нават і трэба знаць суседскую мову, але найперш трэба знаць сваю». Кнігі Ф. Багушэвіча з'ўляліся доказам жыццёвасці беларускай мовы.

Нацыянальна-вызваленчае значэнне творчасці Ф. Багушэвіча велізарна. Гэта стане зусім ясным, калі мы ўстановім сувязь паміж яго ідэямі і работай наступнага пакалення беларускіх пісьменнікаў.

Наступны за Ф. Багушэвічам этап беларускага нацыянальнага руху абумоўлен рэвалюцыйным уздымам 1905 года, барацьбой шырокіх мас за дэмакратычнае абнаўленне жыцця. Нацыянальны рух— адзін з ручаёў агульнага патоку, накіраванага супроць самадзяржаўя.

Бібліяграфія

„Выбраныя творы" К. Крапівы

Гэта кніга *) ахоплівае творчы шлях пісьменніка з 1922 па 1939 год. У ёй два раздзелы — сатыра і п'есы. У гэтым зборніку сабрана ўсё лепшае, што напісана пісьменнікам-сатырыкам за 17 год.

З дня прыходу ў літаратуру (1922 год) і па сёнешні дзень Кандрат Крапіва заўсёды адгукаецца на злобадзённыя тэмы, якія хвалююць наш народ. Яшчэ ў 1923 годзе малады паэт пісаў:

Па планеце пройдзем бурай,
Марксаў помнячы завет,
Свет стары ушчэнт разбурым
I збудуем новы свет.

Войстрым пяром сатырыка ён паказвае перажыткі мінулага. Рэзкай крытыцы падвяргае бескультур'е, бюракратызм, тэхнічную адсталасць вёскі, рэлігію і іншыя парокі, якія засталіся ад мінулага. Вершы К. Крапівы заўсёды насычаны яркімі і жыццёва-праўдзівымі фактамі, яны даходзяць да свядомасці чытача і пераконваюць яго ў праўдзе аўтара, які адстойвае ідэалы сучаснага і будучага жыцця прагрэсіўнага чалавецтва.

У многіх вершах апеў паэт магутнасць непераможнай Чырвонай Арміі.

Шырокай папулярнасцю карыстаюцца ў чытачоў такія яго вершы, як «Чырвоная мятла добра мяла», «Ціт заводзіць новы быт», «Устарэла тэхніка», «Тварам да вёскі», «Ты не лайся, дзядзя, пры савецкай уладзе» і інш.

Байкі К. Крапівы многія ведаюць на памяць. Іх можна пачуць на вечарах мастацкай самадзейнасці, з эстрады. Паэт бязлітасна выкрывае ў іх ворагаў савецкага народа: драпежных падпальшчыкаў вайны—імперыялістаў, апартуністаў, якія не вераць у поспех сацыялізма, раскрадальнікаў народнага дабра. Паэт не засушвае байкі аднастайнасцю вывадаў, маралізуючых навучанняў, ротнастаіць іх дыялагамі, свежымі вобразамі, параўнаннямі. Вельмі шмат увагі аддае паэт паводзінам людзей, савецкай маралі, культуры працы і іншым тэмам, якія выхоўваюць наш народ у комуністычным духу. З найбольш папулярных баек у зборнік увайшлі: «Сука ў збане», «Жаба ў каляіне», «Дзед і баба», «Дыпламаваны баран» і інш.

Сатырычныя творы К. Крапівы напісаны на матэрыяле беларускай рэчаіснасці. Таму ён шмат прыводзіць пагаворак, выразаў і бытавых дэталей з вуснай народнай творчасці.

У драматургію К. Крапіва прышоў ужо склаўшымся пісьменнікам, тады, калі за ім у беларускай літаратуры ўстанавілася слава выдатнага сатырыка. У разглядаемым зборніку прадстаўлены яго лепшыя драматургічныя творы—«Партызаны» і «Хто смяецца апошнім».

Тэма вызвалення Беларусі ад белапольскіх акупантаў з'яўляецца найбольш распаўсюджанай у беларускай літаратуры. Але К. Крапіва ў п'есе «Партызаны» вырашае яе своеасабліва. Ён паказвае народ, паўстаўшы супроць сваіх адвечных прыгнятальнікаў — шляхетных паноў. Мужнасць, гераізм і адданасць радзіме з'яўляюцца неадлучнымі якасцямі герояў гэтай п'есы.

П'еса пабудавана ў форме народнай драмы. Героі яе з'яўляюцца сынамі беларускага народа. Асабліва па-мастацку пераканаўча паказаны вобразы дзеда Бадыля і Батуры. У іх аўтар паказвае мудрасць, якая ўласціва свабодалюбіваму беларускаму народу.

Асобныя сцэны — забойства маці Данілы, весткі аб расстрэле партызанаў, забойства Рыгорам кулацкай дачкі Кацярыны — насычаны глыбокім драматызмам.

Аднак, не ўсе станоўчыя вобразы гэтай п'есы паказаны драматургам з вялікім мастацкім густам.

У камедыі «Хто смяецца апошнім» К. Крапіва зноў варочаецца да сатыры. Але сатырычная камедыя—твор, больш складаны па сваёй форме і зместу, чым яго папярэднія сатырычныя творы.

Паяўленне гэтай п'есы супала якраз з тым момантам, калі партыя выкрыла метад ворагаў, што імкнуліся зганьбаваць сумленных работнікаў нашай краіны. На вобпыце адной навуковай установы драматург паказаў варожую дзейнасць мацёрага паклёпніка Гарлахвацкага, яго падпявалы Зёлкіна і сумленнага навуковага работніка Тулягі, які з прычыны сваёй баязлівасці садзейнічаў дзейнасці паклёпнікаў. Пераўвелічэнне невуцтва ворагаў не адводзіць усё-ж аўтара ад рэалізма. Ворагам ён процістаўляе сумленных вучоных у асобе Чарнавуса, Веры, Левановіча, якіх збліжае з сапраўднымі людзьмі сацыялістычнай рэчаіснасці. Дасціпнасць, чоткая інтрыга і моцны сюжэт надалі гэтай п'есе вялікую мастацкую каштоўнасць.

Той факт, што абедзве названыя п'есы карыстаюцца шырокай папулярнасцю ў савецкага гледача далёка за межамі нашай рэспублікі, сведчыць аб тым, што гэта лепшыя п'есы беларускай савецкай драматургіі. Прысуджэнне тав. Крапіве Сталінскай прэміі паказвае, што ў яго асобе мы маем лепшага прадстаўніка савецкай літаратуры.

Зборніку прадпаслан невялікі артыкул Ю. Дворкінай, якая даволі лаканічна, але правільна ахарактарызавала творчы шлях пісьменніка.

Разглядаемы зборнік паказвае, што К. Крапіва і ў драматычных творах не адыходзіць ад сатыры, а, наадварот, найбольш дасканала прымяняе яе ў сваіх п'есах, што дапамагае яму ярчэй адцяніць ганебныя ўчынкі людзей.

У серыі «Школьная бібліятэка» выходзяць вельмі каштоўныя кнігі, якія спрыяюць дзецям, ды і дарослым чытачам, больш дэталёва знаёміцца з творчасцю беларускіх пісьменнікаў.

А. Е.

*) **Кандрат Крапіва.** «Выбраныя творы», Дзяржаўнае выдавецтва пры СНК БССР. Рэдакцыя дзіцячай літаратуры, серыя «Школьная бібліятэка». 1941. Цана 3 р. 50 к.

Іван Франко

Вольныя санеты

«Чаго ты, хлоп, да рыцараў ступаеш,
Нібы баішся кпінаў ты і сваркі?
Чаго свой молат важкі ты мяняеш
На тонкі і малы разец Петраркі?

Замест змагання з панскім ладам, з царскім,
Схаваўся ў паэтычныя ты хмаркі,
Хоць войстры, а не шкодны ўдар пяснярскі,
Як палыноўкі чарка у шынкаркі».

«Не, я свой молат цяжкі не пакіну,
Ён у маёй, хоць і слабой далоні,
Яго не вырвуць спрэчкі, ані кпіны.

Няспынна ён аб цвёрды камень звоніць,
Камення стук у сэрцы адгукнецца,
А водгук спевам выплывае з сэрца».
1881.

Мая любоў

(З цыкла вершаў «Украіна»)

Яна заўсёды зззяе так
Святою, чыстаю красою,
I на абліччы ясны знак
Любові, шчырасці, спакою.

Яна так хораша пяе,
Яна так многа знесла ліха,
Што ліха тое устае
У кожнай-кожнай песні ціха.

Ці-ж мог, калі яе спазнаў,
Не палюбіць яе сардэчна,
Не ацурацца ўсіх забаў,
Каб верна ёй служыць і вечна?

Ці-ж мог тады хаця-б на міг
Я вобраз любы вырваць з сэрца,
Прайсці спакойна міма ўсіх
Пакут і гора аж да смерці?

I ці-ж пярэчыць тут любоў
Той іншай, а святой любові
Да ўсіх, што льюць свой пот і кроў,
Да ўсіх, якіх гнятуць аковы?

Не, хто ў жыцці не зразумеў
Любові да братоў адзінай,
Той шчыра палюбіць не ўмеў
Цябе, каханая Украіна!
1880.

Пераклад з украінскай мовы **Эдзі АГНЯЦВЕТ.**

Беларускі паэт, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР **Філіп Пестрак** працуе над цыклам вершаў, прысвечаных сацыялістычнаму будаўніцтву на вызваленай зямлі былой Заходняй Беларусі. Адначасова тав. Пестрак прымае актыўны ўдзел у рабоце лекторыя, арганізаванага Беластоцкім гаркомам КП(б)Б для пісьменнікаў і работнікаў мастацтваў гор. Беластока.

На здымку: тав. Пестрак за работай.

Фота А. Сапіра (БЕЛТА).



Выдатная народная песенніца **Захвея Васільеўна Хвораст** (в. Кацёлкі, Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці) Ад яе запісана каля 130 мелодый беларускіх народных песень.

З альбома Р. Шырмы.

Р. Шырма

Выдатная песенніца з народа

Яшчэ ў часы панскай Польшчы, вандруючы ад вёскі да вёскі, мне прышлося выявіць багатую крыніцу народнага меласу ў вёсцы Кацёлкі, Пружанскага павета. Насіцельніцай надзвычайных меладыйных скарбаў, баянам, апяваючым народную долю і нядолю, яго шчасце і радасці, яго думы і глыбокія пачуцці, якімі на працягу цяжкіх год нядолі жыў беларускі народ, з'ўлялася вядомая на цэлую акругу, усімі паважаная 70-гадовая Захвея Хвораст.

Чатыры годы ўзапар кожнае лета прыходзілася наведваць вёску Кацёлкі, засвойваць мелодыі, перакладаць іх на ноты і запісваць народныя звычаі і абрады ад старэнькай бабулькі.

Захвея Хвораст — надзвычайны талент, і не толькі як выдатная народная спявачка, — яна карыстаецца агульнай пашанаю сваёй грамады і суседніх вёсак яшчэ як выдатная павівальная бабка, як чалавек мудры і справядлівы пры розных у жыцці старой вёскі спрэчках і дзяляжах. Яна ходзіць сустракаць прыход на гэты свет новага чалавека, прыбраўшыся ў чыста вымытае, белае ільняное ўбранне, старанна памыўшы рукі. Яна ведае, калі патрэбна дапамога доктара, і ў пагражаючых здароўю выпадках заўсёды своечасова выклікае гэту дапамогу. Яна нічога супольнага не мае з бабкамі-павітухамі забабоннага характару, з бабкамі-знахаркамі. Яна прайшла суровую школу жыцця, працуючы ў панскіх маёнтках яшчэ дзяўчынкаю, калі яшчэ свежа крывавілі на целе народным парваныя ланцугі прыгону. І тады яна складала і недзе ўтойвала ў сабе багатую народную песню, каб пасля аддаць яе на пацеху, на радасць, на адпачынак свайму працоўнаму брату-селяніну і батраку-работніку. Яна не толькі спатыкае новага чалавека, — яна ідзе закрываць вочы і таму, хто прайшоў свой жыццёвы шлях, у яе знойдзецца цёплае слова для кожнай душэўнай раны. Затое якою-ж вялікаю любоўю і пашанай адказваюць і ёй! Нават малыя дзеці, калі яна ідзе праз вёску, з праўдзіваю пашанаю вітаюць:

— Добры дзень, бабулька!

Моладзь, якая жэніцца і выходзіць замуж, спецыяльна запрашае яе на свае вяселлі, дзе Захвея Хвораст займае заўсёды самае пачэснае месца. Там, дзе трэба павесяліць чалавека, яна знае песні, яна скажа слова — прыгожае, мудрае слова, з якім маладому здаецца весялей і лягчэй пачынаць жыццё на новым этапе.

Сярод народных мелодый і песень, запісаных ад Захвеі Хвораст, спатыкаюцца песні старадаўняга ладу і складу, як вяснянкі, калядкі, жніўныя, восеньскія і іншыя. Многа запісана ад яе песень рэкруцкіх, салдацкіх, батрацкіх; сярод бытавых песень віднае месца займае песня аб долі жанчыны: там і горкае замуства, ліхая свякроў і свёкар, цяжкая доля за батраком, калі для дзяцей і хлеба нехапае, там і шчаслівае маладое каханне, і нянавісць да пана і яго прыслужнікаў, якія заглядаюцца на дзяўчыну:

Не хадзі па полю,
Не збірай куколю.
Не маргай вачыма,
Не твая дзяўчына.
Не твая стаенька,
Бо ты не будаваў,
Не твая дзяўчына,
Бо ты не гадаваў.
Дана мая, дана,
Не пайду за пана,
Пайду за такога,
Якая я сама.
Пайшла-б за дварана,
А дваран сабака...

Блізасць пана да беларускай вёскі заўсёды прыносіць толькі гора і няшчасце. Затое якою пагардаю і спапяляючай нянавісцю адказвае народ на панскі адрас:

Зайшло сонца, ўзыйшоў месяц,
А нашага пана вядуць вешаць:
Няхай-жа ён праветрае,
Мо назаўтра палепшае.

Можа, гэта песня і складзена пра нязнанае паўстанне якой-небудзь вёскі супроць панскага гвалту.

Дзеці, якія па старой тэрміналогіі радзіліся «па-за шлюбам», былі паводле папоўска-буржуазнай маралі ганьбай для маткі. Аднак, народ у асобах сваіх лепшых таленавітых прадстаўнікоў, падобных да Захвеі Хвораст, знаходзіць цёплае і спагадлівае слова для дзіцяці, у якога маладая матка-дзяўчына пытаецца:

А мой сынку малюсенькі,
Чы мне цябе ахрысціці,
Чы ў Дунаю утапіці?

Песня адказвае словамі Іванюшы:

Ты, дзяўчынанька дурная,
Ты дурная, неразумна,
Гадуй сынка маленькага.
Як паеду у мястэчка,
Куплю яму калысачку
I павешу на кляночку:
Будзе вятрэц павяваці,
Тваўго сынка калыхаці,
Будуць зязюлькі куваці,
Тваўго сынка забаўляці.

Такой простай і высокай мараллю ў саюзе з прыродай спатыкае народная мудрасць кожнага новага чалавека напера-кор буржуазна-папоўскім «лукавым мудрствавнням» аб грахах «незаконнага» нараджэння.

Ад Захвеі Хвораст запісан цэлы вясельны абрад з песнямі і нотамі і многа песень хрэсбінных. Адных толькі мелодый перакладзена на ноты каля 130. Многія з гэтых песень увайшлі ў рэпертуар Ансамбля беларускай песні і танца ў Беластоку.

I вось, калі Захвея Хвораст даведалася, што ад яе ўжо запісана аж 130 мелодый, яна ўздыхнула і сказала:

— Мусіць, я самая грэшная на свеце!
— Чаму, бабулька?
— Бо так многа ведаю гэтых песень, у нас тут ніхто гэтулькі не знае.

Гэты цікавы выпадак як не трэба лепш характарызуе «культурную» ролю клера, які на працягу вякоў дапамагаў панам адсоўваць народ назад ад адзінае яго радасці — ад роднай песні. Але народ пяяў вуснамі такіх талентаў, як Захвея Хвораст, пяяў пра сваё сумчае жыццё, пра цяжкую долю і пра радасці, аб якіх ён марыў.

Калі-б Захвея Хвораст ведала, якія геніі чалавецтва чэрпаюць натхненне з гэтых бяздонных крыніц народнай красы, то напэўна не залічала-б яна да «грэшных» спраў, хоць можа і падсвядома, сваіх цудоўных скарбаў.

Беласток.

К творческому совещанию красноармейских писателей ЗапОВО

* * *

М. Крючкин

Батальонный комиссар

Мать

Новелла

Слезы уже не бежали из ее глаз. Слез не было. Они высохли от палящего зноя ненависти и горя.

— Сын мой, сын мой...—шептали ее губы, сухие, шершавые, бледные.

Он лежал на столе. На груди конфедератка с хищным орлом. Вместо лица—кровавая маска, но на шее темнела знакомая родинка.

— Мой сын, мой сын! Кровиночка моя...—шептали бледные, шершавые, сухие губы матери. Руки, прижимаясь к высохшей от нужды и горя груди, бессознательно теребили черный, креповый бант.

Тот, кто назывался другом, стоял рядом. Бледное лицо, оттененное черной сутаной, было сурово и хищно. На груди его мерцал крест — тяжелое, массивное распятие. Стебель креста—нож, а рукоятка — распятый бронзовый христос. Лучи заходящего солнца золотили распятие. Длинные, гибкие пальцы скорбно перебирали янтарно-бронзовые четки. Он говорил ей:

— Иезус-Мария! Они отняли жизнь твоего ребенка, отними и ты жизнь у одного из них. Они несут кровь, смерть, насилие, безбожие, — шопот его вырвался со свистом, синие губы змеились в приступе неистовой злобы. — Убей! — шептал ксендз, — и сыну твоему легче будет.

Горячими, сухими, слегка дрожащими руками он положил в ее сморщенную ладонь холодный, смертельный металл распятия. В лучах сверкнуло стальное лезвие.

— Мужа твоего они сгубили своими дьявольскими искушениями и он восстал против власти, христом утвержденной. Мир праху мужа твоего, он смертью воздал за искушение. Теперь сына отняли. Иди! — гибкие пальцы подтолкнули ее в плечи.

Она взглянула на труп сына, она вспомнила смерть мужа. В ушах звучали слова ксендза. Медленно вошла она в комнату, где спал на кровати ее сына он—молодой, розовощекий враг. Она поцеловала лезвие распятия, наклонилась над спящим и занесла руку. Дрогнула рука. Она увидела на шее спящего родинку. Пересохшее горло едва удержало крик. Колеблющейся походкой подошла она к столу и села. Воды! Вода плескалась через край, когда она наливала ее в стакан. Зубы лихорадочно стучали о стекло, когда она пила, и вода струилась на стол, на бумагу.

Письмо... Глаза невольно забегали по строчкам.

... «родная мамочка, вот мы уже в чужой стороне,—вру, не в чужой, а близкой. Они встретили нас, как родных сыновей. Сколько здесь было нищеты и горя, лишений и слез. Я живу у одной старой женщины. Как мне ее жаль! Она два года назад потеряла мужа. Он был большевик. Он не жил дома. Однажды он пришел ночевать в семью и здесь его арестовали. Выдал ксендз: он выследил его и донес. А сына она потеряла в этой войне. Как мне ее жалко. Она одинока. Как хочется хоть на время заменить ей сына. Но она сурова. Горе сделало ее такой...»

Прозрачные слезы, слезы облегчения капали на бумагу. Женщина пошатнулась, подошла к спящему и, взглянув на него, выбежала из комнаты...

***

На полуистлевшей, затоптанной ступеньке крыльца, отбрасывая черную тень, торчал кинжал-крест. Маленький, пушистый котенок тщетно пытался поймать своей нежной лапой солнечный луч, мерцавший на бронзе распятия...

Над садами, над дворами и крышами местечка подымалось с востока яркое, чистое и горячее солнце. Его лучи окрашивали двор в ярко-золотистую дымку. Красная косынка, трепыхавшая на палке, прибитой над воротами, горела как кровь.

Утро наступало свежее, новое.

П. Минин

Советский воин

Смотрите, любуйтесь, гордитесь безмерно:
Он крикнет: «Вперед!» — и откликнется даль.
И зоркое око, и чуткое ухо,
И мускул упругий — каленая сталь!

Смотрите, любуйтесь, гордитесь безмерно:
Он — воин советский, защитник наш верный!

Прошел он не мало дорог и тропинок,
С обрыва крутого спускался в овраг.
Ни в знойное лето, ни лютой зимою
От зоркого глаза не скроется враг.

Прошел он не мало дорог и тропинок,
Его пулемет говорит без запинок!

И песня его боевая задорна,
Вы песни такой не слыхали нигде:
О славном наркоме, о смелых походах,
О мудром, великом, любимом вожде.

И песня его боевая задорна,
Послушаешь — в сердце светло и просторно!

Смотрите, любуйтесь, гордитесь, народы:
Он тот, о ком песен так много поют.
Советскую землю, как мать, он лелеет,
Как девушку, любит отчизну свою.

Смотрите, любуйтесь, гордитесь, народы:
Он — знамя, он — песня, он — символ свободы!

П. Волкодаев

Зам. политрука

1. Другу

Что нашей юности дороже
Страны, где мы с тобой живем!
Поля вскипают зыбкой рожью,
Обмытые косым дождем.

Гремит ручей в далеких кручах.
Сады оделись в белый дым.
И хорошо средь рос сыпучих
Шагать по травам молодым.

Броди, мой друг, по травам гая,
Смотри на тихую зарю,
Носи на кудрях запах мая
И пой про молодость свою.

Броди и думай на рассвете,
Когда еще черешни спят,
Что снова на страну Советов
Враг поднимает волчий взгляд.

2. В дозоре

Хрустнет ветка — снова тишь.
Дремлет в заводи камыш.

И баюкает вода
Звезд узоры — невода.

Слышны всплески изредка.

Рвется пес мой с поводка.

Хрустнет ветка — снова тишь.
Зашушукал вдруг камыш.

Пес зовет меня вперед.
Значит, «гость» уже идет.

* * *

К. Титов

Стихи о Тимошенко

Враги в станице.
Ночь глуха.
Но вот, взметнув клинки,
Ворвались в стойбище врага
Лихие казаки.

Налево — взмах,
Направо — взмах,
Укол — вперед,
Отбив — назад.

— Крепится враг?
— Подался враг?
— Бежит вразброд?
— Сдавайся, гад!

Широкой грудью серый конь
Прокладывает путь.
Начдив разит, в глазах — огонь,
Зубов — не разомкнуть.

На стременах приподнялся:
— На, вражье племя, на!
От крови вражьей шашка вся
Давно черным-черна...

Раздался выстрел у плетня —
Короток смерти счет!
По шее серого коня
Кровь ручейком течет.

Не стало твердости в ногах —
Вперед! Еще! Еще!
Второю пулею врага
Начдив сражен в плечо.

— Стой, Тимошенко!..
Серый мрак
Расплылся по полям...
Свист шашки,
Дикий крик — и враг
Рассечен пополам...

— Товарищ Тимошенко, мы
Забрали верх в бою.
Бандитам отомстили мы
За рану за твою.
Не возвернуться им вовек.
Мы честно говорим...

Скакала по степной траве
Дивизия на Крым:
Налево — взмах,
Направо — взмах,
Укол — вперед,
Отбив — назад.
— Крепится враг?
— Подался враг?
— Бежит вразброд?..
— Сдавайся, гад!

С. Ходыко

Младший лейтенант

В феврале

К утру батальон
Развернулся для боя.
Винтовку-подружку
Согрела ладонь.
Снаряд пролетел,
Оглушительно воя,
И срезал кусты
Пулеметный огонь.


Враги поливали
Свинцом искрометным
Залегшие цепи
Усталых бойцов.
Враги преграждали
Огнем пулеметным
Подходы к высотке
С обоих концов.

Тогда попросили
Бойцы капитана:
«Позвольте нам гадов
Гранатами снять!»
Он молча кивнул...
Под покровом бурана
Два друга ползли
Через снежную падь.

Минуты текли.
Иссякали патроны...
О, радость!
Донесся стихающий взрыв.
Умолк пулемет. —
И бойцов батальона
В атаку метнул
Безудержный порыв.

Рванулись, как буря,
Кустарник ломая,
С винтовками
В крепких, горячих руках.
Враги отступали,
В снегу увязая,
Бессильно свисая
На русских штыках.

И первыми шли —
Славу пела им вьюга! —
Те двое, что сняли
Чужой пулемет:
Два юных бойца,
Два героя,
Два друга,
Со Сталиным в сердце
И с криком:
«Вперед!»



«Выезд на манеўры», акварэль. Карціна настаўніка сярэдняй школы гор. Магілева Г. Пархоменкі. Экспанат выстаўкі «Абарона СССР».

Фотарэпрадукцыя І. Каплінскага.

* * *

Е. Садовский

Третья рота

Рассказ

Павел Богданов был искренне обрадован, когда узнал, что его посылают работать в тот самый полк, откуда он уехал на учебу после окончания срочной службы.

На другой день после приезда Богданова в полк часть выходила на длительные учения, и хотя у Богданова не было своего подразделения, он был горячо обрадован тем, что и ему нашлась работа. Командир полка, тепло встретив своего старого бойца, временно назначил его командовать третьей ротой, постоянный командир которой уехал в срочную командировку. Именно в этой роте Богданов служил до училища и ему было как-то непривычно, что старшина, младшие лейтенанты, которым он еще недавно подчинялся, сейчас были под его командованием.

Когда ротный старшина, рослый здоровяк-украинец Торба, увидел Богданова, лицо его расплылось в широкой улыбке, и он чуть не на весь коридор гаркнул:

— Та, та здорово же, Павлуша. Вось бисов чорт, вже й командир. Горилки, обязательно горилки, распить цю справу.

Павел Богданов вытянулся строго во фронт, как на параде, и, приложив руку к козырьку, коротко сказал:

— Здравствуйте, товарищ старшина.

Торба понял, что его шутки неуместны, и тотчас же, по примеру лейтенанта, вытянулся во весь свой гигантский рост и молодцевато ответил:

— Здравствуйте, товарищ лейтенант.

Первое, что Богданов увидел, когда вместе с Торбой вошел в просторное красноармейское общежитие, это винтовки нового образца, сверкавшие в пирамиде, аккуратно расставленные минометы и скорострельные пулеметы. В эту минуту Богданову вспомнилась встреча курсантов с седоволосым конструктором скорострельных пулеметов и он не удержался, чтобы не рассказать об этой встрече.

Старшина внимательно слушал, не скрывая своего восхищения этим молодым и бывалым человеком. Не где нибудь, — в Москве учился.

— Скажите, товарищ лейтенант, а Любовь Орлову вы видели?

Богданов с удивлением посмотрел на Торбу.

— Любовь Орлову, какую это Орлову? Это что, тоже конструктор?

— Да нет же, киноартистка, что в «Цирке» и «Веселых ребятах» играет. Страсть хочется на живую киноартистку посмотреть.

Богданов рассмеялся.

— Сбили вы меня, товарищ Торба. Я о пулеметах, а вы вон о чем. Нет, не видел, не пришлось.

...Последний, предвыпускной год в училище прошел у Богданова в длительных походах. Зимой курсанты не раз жили в шалашах, сделанных из снега. Суровая школа, которую прошел молодой лейтенант, закалила его. И сейчас в походах он чувствовал какое-то особое удовлетворение, словно шел на выполнение сложной боевой задачи в действительной военной обстановке.

Богданов шагал впереди своей роты и ему вспоминалось, как два года назад он ходил по этим прекрасно знакомым ему дорогам. Но, как на зло, — полк пятый день был в походе, бойцы обветрились, заметно загорели, окрепли, а третья рота почти все время не у дел. Правда, сам по себе марш представлял немалые трудности, но хотелось большего. А тут тебя держат в резерве. Про себя Богданов решил, что ему просто не доверяют, думают, что молод, неопытен. К такому же выводу, не высказывая, конечно, его открыто, пришли и младшие командиры, удивляясь тому, что все получают боевые задания, а третья рота словно забыта.

Наступил девятый и последний день учений. Полк отошел от места своего постоянного расположения километров на 200. Теперь, как никогда, от каждого бойца требовалось напряжение его физических сил, всех его боевых качеств.

И вдруг ночью, когда бойцы отдыхали после длительного марша, командир полка по тревоге поднял третью роту, только третью. Лейтенант Богданов вскочил мгновенно, первым. Не отрывая глаз, слушал он приказание командира полка, едва сдерживая себя от радостного волнения.

«Наконец-то»,—думал он в эту минуту.

— Бойцы устали,—говорил командир полка,—это я знаю. И третья рота устала, но вот именно сейчас важно проверить боевую готовность роты, ее подвижность. Понятно?

— Совершенно понятно, товарищ майор,—четко ответил Богданов.

— Разверните свою карту.

— Есть.

— Найдите Полово.

— Есть Полово.

— Это 19 километров отсюда.—Командир полка посмотрел на Богданова.—Дорога трудная, три переправы. К девяти часам утра быть там. Готовы выступить?

— Вполне готовы. Третья рота, строиться! — громко приказал Богданов, чувствуя в себе необычайный прилив сил.

Командир полка довольно улыбнулся, когда через две минуты Богданов доложил:

— Рота построена и выступает для выполнения боевого задания. Можно двигаться?

— Можно. Желаю успеха.

Где-то в далеком ночном небе, то прячась за облако, то вновь выплывая, холодным блеском сверкала луна, и Богданову казалось, что сейчас она свой нежный взор сосредоточила на третьей роте. Уверенным быстрым шагом пошел он впереди бойцов. Ему хотелось сразу втянуть их в боевой темп, он знал, насколько это важно.

— По-суворовски, товарищи! Раз—два и взяли, — полуобернувшись, сказал он бойцам первых шеренг, и это сразу стало известно всем. Бойцов точно наэлектризовала энергия их молодого командира. Когда прошли 7 километров и окончился привал, Богданов, чтобы было слышно, шутливо сказал Торбе:

— Поспешим, старшина, в Полово. Ручаюсь, Любовь Орлова ждет вас там.

И эта добродушно произнесенная фраза понравилась, потому что в роте знали увлечение старшины.

Было 8 часов 40 минут, когда третья рота без одного отставшего подходила к Полово. Навстречу из деревни показалась машина.

— Майор, майор едет! — пронеслось по рядам.

Поровнявшись с бойцами, машина остановилась.

— Здравствуйте, товарищи! — громко произнес командир полка. — Молодцы.—с удовлетворением констатировал он и протянул руку Богданову.

Д. Ковалев

Красноармеец

Рассказ о топоре

Бывало, мой дед топор откует —
И плотник, и дровосек ликует.
Зато из-за речки, лишь станет лед,
Являлся к нам лесник в мастерскую.
— Ты знаешь, Трофимыч, знаешь, не спорь...

Два дуба за ночь срезал кто-то.
Какому ты вору ковал топор?
И дед отвечал: — Не моя работа.

Однажды старик сельчан удивил:
Убили в лесу панского сына.
Приносит урядник топор в крови —
У трупа найден под старой осиной.
Урядник от гнева стены белей.
Ответил дед с достоинством, смело:
— Топор, — говорит, — работы моей,
Только не помню, кому он делан.

Ант. Сегедзі

Камедыя К. Крапівы ў Ленінградзе

Камедыя-сатыра К. Крапівы «Хто смяецца апошнім»—значная з'ява ў совецкай драматургіі. Галоўнай і асноўнай вартасцю гэтай камедыі з'яўляецца благародная прырода камічнага элементу, які пануе ў п'есе. У ёй няма пустога зубаскальства, параджаемага імкненнем ў што-б там ні стала смяшыць гледача. Амаль няма ў ёй і смеху ад лоўкага літаратурнага прыёму. Смешнае грунтуецца ў п'есе на трапна схопленых драматургам камічных, вартых бічавання смехам з'явах сучаснага жыцця. Не эразумеўшы ва ўсёй глыбіні гэтай асноўнай якасці твора, немагчыма дасягнуць поўнацэннага тэатральнага пераўтварэння яго, знайсці прыўласную яму сцэнічную форму.

Рэжысёры З. Ерухімовіч і С. Гудзенка, якія ажыццявілі пастаноўку «Хто смяецца апошнім» у Ленінградскім Тэатры драмы і камедыі, не зусім ясна ўсвядомілі гэту прыроду смешнага ў творы беларускага сатырыка. У гэтым мы бачым корань прыкрых памылак рэжысуры.

Калі пастаноўшчыкі выкідваюць з другога акта п'есы смешную, але арганічна іншародную, лёгкаважкую, якая не стаіць у прамой сувязі з галоўнай тэмай, сцэну падмены каханкаў Зіначкі і знішчаюць белымі ніткамі прышчыгаваную ролю «пабочнай машыністкі»,—яны маюць рацыю. Яны афяруюць некалькімі мінутамі смеху гледача, смеху, у значнай меры заснаванага на камізме літаратурнага прыёму, дзеля стройнасці спектакля, чоткасці ў развіцці асноўнай інтрыгі. Але калі, нявдома навошта становячыся на шлях рэжысёрскага суаўтарства з Крапівой, яны ўводзяць новую дзеючую асобу—прыбіральшчыцу Наташу, ролю бясслоўную, бяздзейсную, якая назольна маячыць на працягу ўсяго спектакля,—тут яны саступаюць з правільнага шляху і пагляблююцца ў нетры таннага рэжысёрскага трукацтва. Навошта спатрэбілася рэжысёрам памочніца Каці—застаецца абсалютна незразумелым.

Калі пастаноўшчыкі, для скарачэння мёртвага часу ў часе змены карцін, пераносяць дыялагі Нічыпара і цёці Каці пра дзіўнасці навук з першага акта ў інтэрмедыю перад заслонай пры пачатку другога акта, яны робяць лёгкую і нагул даволі нявінную аперацыю. Але калі, імкнучыся быць паслядоўнымі, яны робяць інтэрмедыі перад заслонай сталым прыёмам, ствараючы рознастайныя повады для іх і нават, як мы бачылі, уводзячы дзеля іх новую дзеючую асобу,—яны робяць непаравальную памылку. Рэжысёры навязваюць драматургічнаму твору неўласцівую для яго форму сцэнічнага пераўтварэння. Выраціаць так сатыру Крапівы—усёадно што вырашаць «Вяселле Крэчынскага» як лёгкі вадэвіль. Камізм, які ўносіцца ў спектакль інтэрмедыямі, зусім іншай якасці і пробы, чым камізм п'есы.

На шчасце, якасці, закладзеныя ў прыродзе драматургічнага матэрыялу, аказваюцца ў большай канцэнтрацыі і яны даволі лёгка перамагаюць рэжысёрскія прыправы, застаючыся даволі моцнымі і поўнацэннымі. Усё-ж струмень лёгкаважкага камікавання, прыўнесены рэжысурай, дзе-ні-дзе абяскровіў матэрыял драматурга. Так, у значнай ступені прыглушана сатырычнае гучанне ролі паклёпніка, падхаліма і плеткара Зёлкіна ў выкананні артыста Лапіна. Роля вырашана артыстам у плане вадэвільнага гратэску. Давядзімыя да гіпербалізму рысы характэрнасці знешніх паводзін героя робяцца карыкатурнымі. Вобразы п'есы Крапівы—рэалістычныя тыпы, у якіх толькі рэльефна падкрэслены пэўныя характарыстычныя рысы. Сыграць Зёлкіна ў якасці вадэвільнага дзівака — значыць, зусім не зразумець гэты характар. Некалькі ўдалых акторскіх і рэжысёрскіх дэталей у раскрыцці ролі не змякчаюць прынцыпова няправільнага яе вырашэння.

Са здавальненнем адзначаем, што памылковая інтэрпрэтацыя ролі Зёлкіна з'яўляецца хоць і не выпадковай, але адзінкавай няўдачай у акторскіх работах гэтага спектакля. Рэжысёрская і акторская інтэрпрэтацыя астатніх ролей, як і ўсяго асноўнага дзеяння, правільная і мае шмат вартасцей. Калі дзе-ні-дзе рэжысёры не зразумелі аўтара, дык у цэлым ім удалося стварыць добры, цікавы, патрэбны спектакль. У гэтым не малая заслуга акторскага калектыва.

Гарлахвацкі і Туляга — цэнтральныя вобразы п'есы. Ад правільнага сцэнічнага вырашэння гэтых ролей залежыць каштоўнасць і поспех спектакля. У тэатры яны знайшлі правільнае тлумачэнне ў выкананні артыстаў Неўражына і Раждзесцвенскага. Характары Гарлахвацкага і Тулягі раскрываюцца ў іх узаемасувязі. На адносінах гэтых герояў грунтуецца аснова інтрыгі п'есы.

Артыст Неўражын, выконваючы ролю Гарлахвацкага, знайшоў тое, чаго, як мы ўказвалі, нехапае ў выкананні ролі Зёлкіна, — вайстрыню тыпізацыі ў паказе рэалістычнага вобраза. Мацёры нягоднік з запэцканым антысовецкай дзейнасцю мінулым, які пры дапамозе прыяцеляў аказаўся на «ціхім месцы» дырэктара інстытута геалогіі, устае перад гледачом ва ўсёй сваёй агіднай сутнасці. Тонка і ўдумліва распрацаваўшы драматургічны матэрыял, артыст знайшоў ключ да правільнага псіхалагічнага абгрунтавання сцэнічных паводзін Гарлахвацкага. Артыст Неўражын адмовіўся ад надакучлівага схематычнага штампа шкодніка. Выкананне яго сакавітае, шматфарбнае, расквечана многімі дасканала знойдзенымі дэталямі. Ён іграе ролю Гарлахвацкага з пачуццём сапраўднай тэатральнасці і праўды.

Туляга ў выкананні артыста Раждзесцвенскага таксама адна з найбольшых удач спектакля. Туляга—асоба, вядома, далёка не станоўчая. Абывательская баязлівасць наскрозь атруціла яго існаванне. Туляга і яму падобныя—найбольш спрыяючае асяроддзе для дзейнасці Гарлахвацкіх. Ці адбываецца ў п'есе перараджэнне Тулягі? Скажам рашуча — не. Туляга трапляе пад спрыяючы ўплыў калектыва совецкіх служачых. Дзеянні яго робяцца дзеяннямі совецкага грамадзяніна. Але і толькі. Унутранага перараджэння Тулягі тут не адбываецца. Драматург пазбятае фальшывай схематычнасці раптоўнага перараджэння героя. Тулягя павінен прайсці яшчэ вельмі вялікі, цяжкі і своеасаблівы шлях, перш чым ён канчаткова пераможа ў сабе груз абывательшчыны і інтэлігентшчыны. Артыст Раждзесцвенскі зразумеў і перадаў усё гэта вельмі тонка і правільна. Туляга ў яго выкананні — асоба жывая і переканаўчая. Думаецца, што актору трэба яшчэ і яшчэ папрацаваць над шліфоўкай дэталей вобраза. Тэкст ролі захоўвае шмат нявычарпаных акторам каштоўных штрыхоў, рэалізацыя якіх надзвычай узбагаціла-б выкананне.

Станоўчыя вобразы ўдаліся Крапіве значна слабей. Гэта ў нейкай ступені заканамерна для данай п'есы. Выкарыстаўшы ўсю энергію, увесь творчы запал на абрысоўку яркіх, сакавітых вобразаў Гарлахвацкага, Зёлкіна, Тулягі, драматург выпісвае астатнія дзеючыя асобы больш лёгкаважка, абрысоўвае іх бегла. Чарнавус, Левановіч, Вера—гэта толькі эскізы і прытым контурныя. Гэта не характары, а нейкія ўмоўныя фігуры. Вобразы станоўчых герояў драматург аддаў у распараджэнне рэжысёраў і актораў, прадаставіўшы ім права канкрэтызіраваць, ажыўляць гэтыя асобы сродкамі тэатра. Тым большая заслуга тэатра, што яму сапраўды ўдалося ажывіць некаторыя з іх, зрабіць пераканаўчымі, праўдзівымі.

Асабліва ўдалая работа артыста Доўгашэева над роляю Чарнавуса. Сумленны совецкі вучоны, якога спрабуе зганьбаваць Гарлахвацкі, маючы на мэце «прыручыць» яго, зрабіць з яго праслаўляльніка «сваіх» навуковых работ, раскрываецца ў спектаклі як вобраз совецкага доктара Штокмана, чалавека бязмежна аддананага навуцы і да канца прынцыповага, чалавека даверлівага, які лёгка памыляецца ў людзях. Актор удала знайшоў рысы знешняй характэрнасці—раскіданасць рухаў, прафесіянальную сутарбленасць.

Сродкамі войстрай жанравай характэрнасці карыстаюцца для ажыўлення вобразаў таксама акторы Чэркасаў і Вертаусава, якія выконваюць ролі Нічыпара і цёці Каці. Элементы жанравай характэрнасці былі ў драматургічным матэрыяле. Акторы развілі іх вельмі непасрэдна і жыва.

У чым-жа галоўная вартасць гэтага спектакля ў Ленінградскім Тэатры драмы і камедыі? Галоўная і бясспрэчная вартасць спектакля заключаецца ў яго мажорным гучанні. Агідныя з'явы, якія, нажаль, маюць месца ў нашай рэчаіснасці, паказаны ў правільным ідэалагічным тлумачэнні. Вартасць спектакля заключаецца ў тым, што ён мастацкімі сродкамі з ўсёй відавочнасцю дакязвае заканамернасць няўхільнага знішчэння рэштак капіталізма ў свядомасці людзей социялістычнага грамадства.

Дзеянне наблізілася да развязкі. Гарлахвацкі зарапартаваўся. Даклад аб «мамантавай свінні», якая жыла ў «пензенскі перыяд», лукава падсунуты яму Тулягам, выкрыў поўнае невуцтва прахадзімца, які спрабаваў стварыць сабе імя ў навуцы, выкарыстоўваючы чужую працу. «Свінтус грандыёзус» прадстаў перад усімі ў сваю натуральную велічыню і без усякай маскі.

Зямля выслізнула з-пад ног Гарлахвацкага. Трагізм яго становішча смешны, як смешны і трагізм становішча Зёлкіна, на вачах якога адбываецца падзенне яго патрона, ва ўгоду якому ён толькі што, «не ўлічыўшы сітуацыі», сказаў падхалімскую прамову.

Кар'ерызм, падхалімства, паклёпніцтва не могуць існаваць у асяроддзі сумленных совецкіх людзей, якія смела, прынцыпова, да канца змагаюцца за сваю справу. Гэта раскрыта ў п'есе Крапівы і ў спектаклі Ленінградскага Тэатра драмы і камедыі з усёй пераканаўчасцю і сілай. І ў гэтым адказ на пытанне, пастаўленае аўтарам у назве п'есы «Хто смяецца апошнім».

Смяецца стары прафесар Чарнавус, які ўсе свае сілы аддае навуцы; смяюцца Левановіч і Вера; смяецца пасмялеўшы Туляга; смяюцца Нічыпар і цёця Каця, а разам з усімі смяецца і глядач. Смяецца весела, раскаціста і гучна. Смяецца апошнім.

„Хлопец з нашага горада“

Прэм'ера ў Другім Дзяржаўным беларускім драматычным тэатры.

Сама назва твора ўжо сведчыць аб тым, што п'еса прысвечана аднаму герою. Пісьменнік К. Сіманаў у сваёй драматургічнай хроніцы паказвае, як радавы савецкі грамадзянін Сяргей Лукогін, дзякуючы вучобе, упартай працы, асабістай настойлівасці і складаўшымся акалічнасцям нашай рэчаіснасці, вырастае ў знатнага чалавека —Героя Савецкага Саюза.

Аўтар прышоў у драматургію ад паэзіі, таму яго п'еса ў сваёй пабудове шмат чым больш нагадвае паэму, чым закончаную драму з усімі ўласцівымі ёй асаблівасцямі. Калі гэта некалькі адбіваецца на форме твора, дык на змест яго не аказвае асаблівага ўплыву. Ідучы па слядах біяграфіі Лукоміна, паэт не шукае нейкіх штучна-востры драматычных канфліктаў, а паслядоўна апавядае пра найбольш характэрныя этапы жыцця маладога чалавека нашага часу.

Любоўныя ўзаемаадносіны паміж Сяргеем і Варай напаўняюць п'есу шчырымі чалавечымі пачуццямі і надаюць ёй лірычны характар. Асабістае жыццё героя ўпадпарадкавана грамадскім інтарэсам.

Народны артыст БССР П. Малчанаў паставіў спектакль у лірычным плане. Ён адчуў паэзію нашага выдатнага жыцця. Цеплыня і абаяльнасць, прыязны жарт і пранікнёныя пачуцці кахання адчуваюцца ва ўсёй пастаноўцы. Усе гэтыя расстанні, сустрэчы, чаканні каханых людзей, якія так характэрны для паэзіі К. Сіманава, знайшлі яркае ўвасабленне ў сцэнічным варыянце твора.

У першай частцы спектакля ўвага пастаноўшчыка акцэнтыруецца на асабістым жыцці Сяргея Лукоміна, на яго любоўных пачуццях да Вары. У другой частцы найбольш шырока раскрываецца баявая дзейнасць Лукоміна, яго дружба з таварышамі па службе. Аднак, гэтыя часткі спектакля рэжысёр не разрывае, а ўзаемна ўвязвае, паказваючы, што яны адна другую дапаўняюць.

Асноўная ідэя пастаноўкі закладзена ў яе цэнтральным вобразе — Сяргею Лукоміну. У п'есе ўзят яго сямігадовы жыццёвы шлях (з 1932 па 1939 год), насычаны цікавейшымі перыпетыямі, якія найбольш паказальна фарміруюць яго характар. У пачатку актор П. Малчанаў паказвае Лукоміна гарэзным юнаком, настойлівым і ўпэўненым у сваіх учынках, у сіле і волевасці свайго характару. У гэтых паводзінах ёсць яшчэ дзіцячае зухвальства, якое здаецца наіўным і смешным. Іншы раз імкненне Лукоміна не падначальваецца яго жаданню і ён трапляе ў няёмкія становішчы, як гэта здарылася на манеўрах. Але нават і ў дадным выпадку ім кіруе благародная мысль—авалодаць майстэрствам ваджэння танка па любой мясцовасці, што з часам і было ім бліскуча даведзена. Яго мары ўвесь час звернуты ў будучыню. Таму яго разважанні не проста плод рамантычных імкненняў, а рэальныя мары, якія паслядоўна ажыццяўляюцца.

Аўтар імкнецца абагуліць вялікія пачуцці, якія ўласцівы выдатным людзям нашага часу, у цікавым і змястоўным вобразе Сяргея Лукоміна. Упэўненасць, мужнасць і маладосць ужываюцца разам у гэтым вобразе і знаходзяць своеасаблівае выражэнне ў праўдападобных учынках. Усё жыццё Лукоміна прысвечана ваеннай дзейнасці, на гэтым попришчы ён і знаходзіць прымяненне сваім здольнасцям.

Рамкі асабістага жыцця Лукоміна пашыраюцца праз сувязь яго з акружаючым калектывам прыяцеляў. Гэта робіць вобраз больш абаяльным і лірычна цёплым.

Вобраз Вары (заслужаная артыстка БССР М. Бялінская), баявой падругі Лукоміна, створан даволі ярка. У першай сцэне добра паказана дзявочая гордасць Вары, яе скромнасць. У наступных сцэнах яе гарачае каханне адцяняецца то лёгкім сумам, то іскрыстай радасцю, то летуценнымі ўспамінамі аб каханым чалавеку. Яна не толькі жонка, але і добры таварыш і дзейсная грамадская работніца, хоць грамадскі твар яе паказан у спектаклі мімаходам.

Сцэна з спектакля «Хлопец з нашага горада», 10-я карціна. Злева направа: Гуліашвілі — засл. артыст БССР **П. Іваноў**, Сяргей Лукомін — нар. артыст БССР **П. Малчанаў**, Севасцьянаў — артыст **А. Трус**.

Фота С. Гуца.

Вельмі цікавы вобраз Аркадзія Бурміна стварыў заслужаны артыст БССР Н. Звездачотаў. Абаяльны гумар, якім пранізан гэты вобраз, адпавядае той лёгкасці і празрыстасці, якія ўласцівы ўсяму спектаклю. Сцэны няўдалага рамана Бурміна з Жэняй з'яўляюцца сцэнічна найбольш цікавымі эпізодамі, якія сведчаць аб майстэрстве гэтага пранікнёнага актора, умеючага тонка паказваць характар ствараемага вобраза. Удалыя сцэны сустрэч Бурміна з Сяргеем Лукоміным. Майстэрска зроблена рэжысёрам і акторам смерць гэтага героя. Яна ўразаецца ў памяць гледача і пакідае глыбокі след.

Два капітаны — Гуліашвілі (заслужаны артыст БССР П. Іваноў) і Севасцьянаў (артыст А. Трус) ствараюць у спектаклі атмасферу таварыства, шчырай дружбы паміж імі і Лукоміным. Гэта набліжае Лукоміна да калектыва баявых камандзіраў. Але калі актор Іваноў свабодна адчувае сябе ў сваёй ролі, не утрыруе нацыянальных асаблівасцей свайго героя, а паказвае ў ім пачуцці клопатаў аб прыяцелю, дык актору Трусу трэба яшчэ працаваць над тым, каб у яго вобразе было больш абаяльнасці, цеплыні, чаго зараз крыху нехапае.

Прыемнае ўражанне робяць артыстка Рамані (Анна Іванаўна), артыст Кавальчук (Сафонаў), артыст Тупік (Ілья Лукомін). Кожны з іх стварыў своеасаблівы вобраз, які дапамагае агульнаму раскрыццю ідэі спектакля.

Не гледзячы на тое, што п'еса не мае стройнага драматургічнага сюжэта, тэатр дабіўся таго, што гэты прабел папоўнен: акторы стварылі цікавую групу станоўчых вобразаў, якая ўтварае поўную лірычную атмасферу і дапамагае ярчэй раскрыць біяграфію Сяргея Лукоміна, прайшоўшага шлях ад юнака да Героя Савецкага Саюза, ад лейтэнанта да маёра.

Ёсць некаторыя недапрацоўкі ў спектаклі. Агульныя контуры камбрыга Васнячова правільна намечаны заслужаным артыстам БССР Ц. Сяргейчыкам, але ўнутраная сутнасць вобраза яшчэ не знойдзена. Па свайму зместу вобраз гэты некалькі нагадвае Бору з фільма «Валерый Чкалаў», — ён клапатлівы, спакойны, але разам з тым строгі. Трэба пазбягаць аднастайнасці, трэба шукаць канкрэтнае аблічча героя.

Артыстка А. Чэрэднічэнка не знайшла вобраза Жэні. У першай сцэне з Аркадзіем яна адчувае сябе абыякавай; другая сустрэча праходзіць лепш.

Скаванай адчувае сябе артыстка Е. Лагоўская ў вобразе францужанкі Сюллі. У сцэне з Варай (у артыстычным пакоі) спачуваць Вары трэба цяплей.

Рэжысёру трэба яшчэ папрацаваць над сцэнай, якая паказвае, што Сяргей Лукомін трапіў у палон. Яна зроблена ў нейкіх таямнічых тонах. Хаця трэба заўважыць, што гэты чужародны эпізод—з прысмакам дэтэктыву—дарэмна ўключан драматургам у п'есу. Ён хіба толькі апраўдвае момант вывучэння Сяргеем французскай мовы. Канцоўку сцэны трэба змяніць, каб яна была больш рэальнай.

Патрабуе дапрацоўкі і 10-я карціна. У ёй павінен быць больш адчувальным уздым, з якім танкісты ідуць на штурм. Трэба лепш мізансцэніраваць яе.

Афармленне спектакля (мастак Е. Ніколаеў) некалькі ацяжэльвае спектакль дэталямі (10-я сцэна), няма ў ім лёгкасці, празрыстасці і лірычнасці, што ўласціва пастаноўцы. Не адчуваецца прасторы. Іншы раз актору нават недзе рухацца.

Аднак, усе гэтыя недахопы не зніжаюць якасцей цікавага, актуальнага і мастацка добрага спектакля. Гэты абаронны спектакль, які адлюстроўвае быт баявых камандзіраў Чырвонай Арміі, глядач прымае добра. Пастаноўка ўзнімае вартасць савецкага грамадзяніна, выхоўвае благародныя пачуцці любві да радзімы.

А. ЕСАКОЎ.

Берагчы дзіцячыя галасы!

Праведзены нядаўна агляд дзіцячай мастацкай самадзейнасці раёнаў гор. Мінска ўказвае на вялікі рост творчых магчымасцей дзяцей, на цягу іх да мастацтва ва ўсіх яго відах. Таленавітыя, здольныя дзеці майстэрска дэманстравалі свае здольнасці ў розных галінах мастацтва. Сустракалі мы тут і старых знаёмых — удзельнікаў ранейшых алімпіяд. За невялікі прамежак часу яны мастацка выраслі.

На аглядзе былі паказаны харавыя калектывы, у рабоце якіх прынцыпова правільна пастаўлен вакальны бок. Дробныя недахопы, скажам, недастаткова падрыхтаваны рэпертуар, з прычыны нядаўняй арганізацыі калектыва, альбо выканальніцкія моманты ў трактоўцы кіраўніка могуць быць лёгка выпраўлены. Да лепшых калектываў трэба аднесці хоры 1-й і 9-й школ (кіраўнік тав. Леўчанка). Асноўнае, што радуе ў іх слухача, гэта лёгкі, не фарсіраваны дзіцячы гук. Добрае ўражанне стварылі маладыя калектывы 20-й школы (кіраўнік тав. Рубніч), 25-й школы (кіраўнік тав. Каждан). Дзіцячы хор кінотэатра, падабраны па ўзроставаму прынцыпу (2-гі, 3-ці класы), гучыць свежа, арганізавана. Недахопам гэтага хора трэба лічыць злоўжыванне сілай гуку і цяжкімі, высокімі па тэсітуры для гэтага ўзросту творамі (напрыклад, «Грудью встань за советскую землю», музыка Карчмарова).

Побач з радаснымі з'явамі прыходзіцца канстатаваць факты зусім процілеглыя. У выкананні хора 47-й школы (кіраўнік тав. Місюкевіч) дзеці спяваюць крыклівым, напружаным гукам. «Тачанка» (музыка Лістова) у абаронным мантажы тойжа школы не адпавядае (высокая тэсітура) магчымасцям дзяцей гэтага ўзросту (3-ці, 4-ты класы), з прычыны чаго частка дзяцей у канцы кідае спяваць, частка пераходзіць на крык.

Ансамбль 49-й школы (кіраўнік тав. Шыгер) і выкананне частушак ансамблем 21-й маюць той-жа недахоп — спяванне замяняецца крыкам. Такі метад спявання трэба асудзіць, таму што ён безумоўна шкодны. А гэта наглядалася амаль ва ўсіх групах, выконваючых літаратурна-музычныя мантажы.

Добра захаваны сёння дзіцячы голас—гэта багацце будучага спевака. Улічваючы гэта, Усесаюзная вакальная канферэнцыя, якая праходзіла ў студзені—лютым 1940 года, зрабіла вывад, што ахова дзіцячага голасу павінна быць пастаўлена на прынцыповую вышыню, каб праз колькі год мець поўнацэнны матэрыял для спецыяльных курсаў вакалістаў.

Дзіцячы галасавы апарат — вельмі далікатны інструмент і ўвесь час знаходзіцца ў стадыі росту. Задача аховы дзіцячага голасу, коратка, зводзіцца да наступнага. Трэба ведаць прыроду, асаблівасці дзіцячага голасу (дыяпазон, сіла, тэмбр) у розныя ўзросты і, выходзячы з гэтага, яго магчымасці. На падставе поўных звестак у гэтай галіне трэба прывіваць дзецям навыкі правільнага дыхання, гукаўтварэння і дыкцыі, нічым не насілуючы малады арганізм, выкарыстоўваючы дзіцячае спецыфічна лёгкае, празрыстае гучанне, не капіруючы дарослых.

Недахопамі, якія наносяць велізарную шкоду дзіцячаму голасу (у большасці выпадкаў непапраўную: страта альбо сапсаванне голасу), трэба лічыць крыклівы белы гук, фарсіроўку груднога гучання, не адпавядаючага дыяпазону дзіцячага голасу, рэзкія пераходы ад груднога гучання да галаўнога.

Прыходзіцца адзначыць, што пералічаныя недахопы адносяцца да харавых калектываў, якія працуюць без кіраўніка альбо якімі кіруюць людзі, незнаёмыя з работай дзіцячых хораў.

Трэба спыніцца таксама на недапушчальнай абмежаванасці выканання дзіцячых, піонерскіх беларускіх песень. Нашы кампазітары, відаць, недаацэньваюць такіх удзячных выканаўцаў, як дзеці. Жаданне дзяцей спяваць на роднай мове такое вялікае, што яны выконваюць тыя беларускія народныя песні, якія чуюць. Але не ўсе гэтыя песні падыходзяць ім па зместу, адсюль і немастацкасць выканання (напрыклад, «Полька-янка», «Лявон»). Гэта, аднак, не гаворыць аб тым, што дзецям не трэба спяваць любоўных песень, — добрым прыкладам можа служыць выкананне «Казачай развітальнай» (музыка Ліфшыца) вучаніцай 45-й школы Фішэр.

Мы не павінны забывацца, што дзеці, прымаючы ўдзел у самадзейнасці, слухаючы яе, мастацка выхоўваюцца, бо вядома, што мастацкае выхаванне з'яўляецца часткай комуністычнага выхавання. Нельга прайсці міма такога, напрыклад, прыкрага факта. На раённых аглядах дзіцячай мастацкай самадзейнасці журы былі падабраны па дзіўнаму прынцыпу. На аглядзе Варашылаўскага раёна прысутнічалі толькі майстры балетнага мастацтва, на аглядзе Кагановіцкага раёна нікога з работнікаў мастацтва зусім не было, на аглядзе Сталінскага раёна былі толькі драматычныя артысты. У ацэнцы здольнасцей дзяцей кіравацца адной інтуіцыяй нельга. У журы аглядаў мы маем магчымасць заўсёды мець кваліфіцыраваных прадстаўнікоў розных галін мастацтваў. Важна не толькі правільна ацаніць выкананне, яшчэ важней даць напрамак на будучае, указаць на недахопы і спосабы іх знішчэння.

Для знішчэння ўсіх недахопаў у рабоце з дзіцячымі хорамі неабходна арганізаваць семінар для іх кіраўнікоў, які дасць магчымасць людзям, не маючым спецыяльнай харавой адукацыі, але валодаючым якім-небудзь інструментам, голасам, невялікімі ведамі музычнай граматы, людзям, любячым гэту справу, папоўніць прабел у сваіх ведах. **А. ЮШКЕВІЧ.**

Дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга беларускі драматычны тэатр паказаў свайму гледачу прэм'еру камедыі «У стэпах Украіны» лаўрэата Сталінскай прэміі **А. Карнейчука.** Пастаноўшчык Л. Рахленка, мастак Д. Уласюк. На здымках — сцэны спектакля. Злева: Палашка — засл. артыстка БССР **Л. Ржэцкая** і Часнок — нар. артыст БССР **В. Уладамірскі;** зверху: Параска — засл. артыстка БССР **В. Полла** і Галушка — засл. артыст БССР **Г. Грыгоніс.**

Фота І. Каплінскага.

Фрыц Крэйслер

Радыё прынесла навіну аб вулічнай катастрофе, якая адбылася ў Нью-Йорку з вядомым скрыпачом Фрыцам Крэйслерам, у выніку якой музыкант атрымаў цяжкія раненні.

Цяжка пераацаніць значэнне гэтага выдатнага мастака для сучаснага мастацтва, бо яно даўно перашагнула рамкі скрыпічнага выканальніцтва: ні адна з галін сумежных мастацтваў не пазбегла яго ўплыву, і ён па праву заняў адно з першых месц сярод буйнейшых музыкантаў нашага стагоддзя.

Фрыц Крэйслер нарадзіўся ў 1875 годзе, музычную асвету атрымаў у Парыжы: у Масара — па скрыпцы, у Дэліба — па кампазіцыі.

Пачаўшы канцэртную дзейнасць на рубяжы дваццатага стагоддзя, ён з першых-жа крокаў пачаў шукаць новыя сродкі скрыпічнай выразіцельнасці, і калі не знайшоў дастатковага матэрыялу ў існаваўшай тады скрыпічнай літаратуры, дык пачаў сам пісаць творы, спачатку ў стылі старых майстроў (Пуньяні, Франкёр, Вівальдзі, Куперэн), а потым зусім арыгінальныя, дзе паказаў сябе спелым майстрам, які мае своеасаблівую гарманічную мову і тонка адчувае скрыпічныя фарбы.

Апрача таго, ён перагледзеў літаральна ўсю музычную літаратуру, пачынаючы з XVI—XVIII стагоддзяў да нашых дзён, стварыўшы серыю выдатных транскрыпцый і апрацовак для скрыпкі і фортэп'яна, якія надзвычай узбагацілі скрыпічны рэпертуар і ў шмат разоў пашырылі яго межы за кошт лепшых узораў кампазітараў усіх часоў і народаў.

Адначасова ён рэдагуе асноўныя творы скрыпічнага рэпертуару, піша кадэнцыі да канцэртаў (Бетховен, Брамс, Паганіні), і гэтыя даўно вядомыя творы пачынаюць зіхацець новымі фарбамі, нібы пачынаючы сваё другое жыццё. Як узор такой работы, можна прывесці санату Тарціні, вядомую пад назвай «Д'явальскія трэлі». Гэты твор, дапоўнены выдатнай кадэнцыяй Крэйслера, зараз з'яўляецца неадлучнай часткай рэпертуару кожнага канцэртуючага скрыпача.

Выканальніцкае майстэрства Фрыца Крэйслера патрабуе спецыяльнага даследвання. Няма магчымасці ў кароткім артыкуле апісаць яго. Адзначым толькі галоўнае. Яго майстэрства скрыпача такое пераканаўчае, такое пакараюча чаруючае, што наўрад хто з сучасных артыстаў не адчувае жадання пераймаць яго.

Арсенал скрыпічнай выразіцельнасці яго надзвычай вялікі. Яго кантылена бліжэй чым у каго-б там ні было да ідэальнага чалавечага спеву. Яго своеасаблівыя глісандо, партаменто, вібрацыя прымушаюць часам забыцца аб інструменце, на якім ён іграе. Здаецца, што гукі нараджаюцца па-за ўсякай залежнасцю ад матэрыяльных сродкаў.

Яго выканальніцкай манеры ўласцівы ўдала знойдзены акцэнт, пікантнае валоданне штрыхамі, закончанасць і вайстрыня формы, што выяўляе ў ім прамога патомка венскіх музыкантаў.

Але галоўнае ў яго майстэрстве — тая незвычайная пранікнёнасць, якая робіць у яго выкананні аднолькава значнымі і дробную віртуозную мініятуру і буйную канцэртную форму.

Фрыц Крэйслер — гэта, бесспрэчна, веха ў мастацтве. Яго імя ўвойдзе ў гісторыю побач з такімі майстрамі, рухаўшымі скрыпічнае мастацтва, як Паганіні, Вяняўскі, Сарасата, Ізаі.

Савецкая скрыпічная школа, якая ўвабрала ў сябе лепшыя традыцыі сусветнай культуры, з вялікай цікаўнасцю і ўважлівасцю сочыць за дзейнасцю Фрыца Крэйслера. Яго творы ўвайшлі для вывучэння ў праграму нашых кансерваторый. Нашы скрыпачы ахвотна і часта выконваюць іх. У сваю чаргу Крэйслер праяўляе жывейшую цікаўнасць да савецкіх музыкантаў. Тая ўвага, з якой ён аднёсся да нашых скрыпачоў — лаўрэатаў Брусельскага конкурса, красамоўна сведчыць аб гэтым.

Пажадаем Фрыцу Крэйслеру, нашаму выдатнаму сучасніку, хутчэйшага выздараўлення і прадаўжэння яго бліскучай дзейнасці ў мастацтве.

А. ЖАЛЕНЦ.

Цім. Зарэчны

Старыя ліпы

Апавяданне

Бадай, самым прыгожым месцам у Рупічах быў узгорак, на якім стаяла школа. Унізе, сярод мурожнай сенажаці, працякала рэчка, на паўднёвым схіле раскінуўся сад, на заходнім і паўночным — невялікі гаёк з ёлак і соснаў. Перад школаю, пад самымі вокнамі, раслі кусты язміну, дзікай ружы, чырвонай бузіны, белага і лілёвага бэзу, некалькі дрэўцаў мадрыны, а крыху паводдаль — кляновыя і ліповыя прысады. Асабліва прыгожымі былі старыя ліпы: высокія, купчастыя, з магутнымі кронамі, яны ахоўвалі будынак ад вятроў і надавалі ўсёй мясціне непаўторнае харавство. Мабыць, ад гэтых прыгожых ліп і ўзгорак атрымаў назву — Ліпкі.

Усе рупіцкія жыхары любілі Ліпкі. У красавіцкія вечары, калі на Імшыцы шуміць паводка, дзяўчаты прыходзяць сюды гукаць вясну; у святочны чэрвеньскі дзень, калі цвіце ліпа і пахне мёдам, тут наладжваюцца скокі; у ліпеньскую альбо жніўеньскую спякоту пад дрэвамі адпачывае прахожы; у раннюю восень, калі пад нагамі шуршыць залацістае кляновае і ліпавае лісцё, у Ліпках гучыць вясёлы дзіцячы смех. Скончыўшы школу, дзеці падрасталі і раз'язджаліся ў розныя бакі краіны. Праз многа, многа год, дзе-небудзь на Далёкім Усходзе альбо ў Сярэдняй Азіі, былога рупіцкага вучня ахопіць туга па радзіме — і ўспомняцца яму Ліпкі, высокія прысады, шуршанне залацістага лісця пад нагамі.

Любіла Ліпкі і Юлія Андрэеўна. Дваццаць год назад, калі яна прыехала ў Рупічы, першае, што кінулася ёй у вочы, былі высокія ліпы і клёны: от такой яна і ўяўляла ў сваіх марах школу! Высокія прыгожыя дрэвы сталі ёй блізкімі, роднымі: яны былі сведкамі яе юнацтва, шчаслівага кахання, радасці і гора. Калі ёй аднойчы прапанавалі пераехаць у іншую школу, яна горача запратэставала:

— Ніколі і нізашто не пакіну Рупічы!

Ёй хацелася сказаць, якія прыгожыя ў Рупічах ліпавыя прысады, і гай, і кусты язміну пад вокнамі, але словы яе маглі палічыць сантыментальнымі, і яна не сказала іх.

У ясную верасвёўскую раніцу Юлія Андрэеўна ўваходзіла ў клас і дружны хор дзіцячых галасоў адказваў на яе прывітанне. Роўна і спакойна пачынаўся рабочы дзень, размежаваны на ўрокі і перапынкі. Рыпелі пер'і, шалясцелі сшыткі, гучаў няўстойлівы, ломкі і палахлівы галасок дзяўчынкі з першага класа. А за вокнамі ішла восень: плыло ў паветры белае павуцінне, пераляталі чародкі гракоў, па выбоістай дарозе, перапляценай карэннямі дрэў, рыпелі вазы з бульбай. У вокны школы ўглядаліся высокія, старыя купчастыя ліпы, і ад іх блізасці ў пакоі рабілася больш цёпла і ўтульна.

Аднойчы, вядучы ўрок, Юлія Андрэеўна раптам заўважыла, што ўвага класа накіравана на іншае: усе твары павярнуліся да вокнаў, з-за якіх даносілася глухое стуканне сякеры па дрэву. Юлія Андрэеўна здрыганулася. Не паспела яе свядомасць афарміцца ў поўную думку, як пачуўся палахлівы дзіцячы вокліч.

— Ліпы сякуць!..

Схапіўшыся рукою за сэрца, Юлія Андрэеўна кінулася да акна. Тое, што ўбачыла яна, прымусіла яе абаперціся аб падваконнік, каб не ўпасці: два чалавекі пілавалі крайнюю ліпу, а трэці падсякаў яе з процілеглага боку. Забыўшыся папярэдзіць вучняў, каб прадаўжалі зададзеную работу, Юлія Андрэеўна пабегла з класа.

У класе загаманілі, зашумелі. Становячыся на парты, штурхаючы адзін другога, дзеці аблялілі вокны, шырока адкрытымі вачыма ўставіліся ў пільшчыкаў. Пачуліся воклічы:

— Палову адпілавалі ўжо!

— А на гэтай-жа ліпіне шпакоўня!

— А на суку — гутарэлі!

— От, бахнецца аб зямлю!

— Дзяўчаткі, далей ад вокнаў, а то як ударыць!

— Так ім і дасць Юлія Андрэеўна секчы?!

— І навошта ім ліпіна здалася?

— На дровы, от! Бачыш, таўстая якая!

— Мала дроў у лесе, ці што?

— Я ведаю, хто пілуе... Падсякае Трахім з сельсовета, а пілуюць Андрыян і Пархвен...

— От, пабягу да дзядзькі Пархвена, ён мне сук дасць на стрэльбу!

Услед за белагаловым хлапчуком, які пабег прасіць ліповы сук на стрэльбу, кінуліся да дзвярэй і іншыя дзеці. Пераганяючы адзін другога, спатыкаючыся, перакульваючыся, войкаючы, яны падбеглі да ліпы і абкружылі яе. Утароплены пільшчыкі здзіўлена пазіралі то на Юлію Андрэеўну, якая сароміла іх, то на дзяцей, якія свідравалі іх непрыязненымі позіркамі.

— Ды мы што... Мы нічога,—апраўдваўся Трахім, вартаўнік сельсовета, пануры і ціхі чалавек.

— На стайню гонт патрэбен, ён і паслаў нас, — дадаваў Пархвен, высокі васпаваты цясляр, які падрадзіўся накрыць сельсавецкую стайню.

— Ды па мне — хай яны сто год стаяць, унукаў і праўнукаў радуюць!— жвава ўсклікваў Андрыян, пераступаючы з нагі на нагу і вінавата пазіраючы на настаўніцу.

— Дык вось,—гаварыла, хвалюючыся, Юлія Андрэеўна, — ідзіце і скажыце таварышу Канапельку, што ліпы я не дазваляю секчы. Стаяць яны на школьным участку, і за іх адказваю я. Вось! — ускліннула яна, папраўляючы валасы, якія пакамечыў вецер, і ўздрыгваючы.— А вы, — звярнулася яна да вучняў, — марш у школу!

Дзеці гурбой пабеглі ў клас. Пасеўшы за парты, яны ўзяліся за пакінутую работу. Па-ранейшаму зашалясцелі сшыткі, зарыпелі пер'і — роўна і спакойна прадаўжаўся ўрок. Але раптам зноў пачуліся глухія ўдары сякеры. Глянуўшы ў акно, Юлія Андрэеўна ўбачыла тых самых пільшчыкаў, якія завіхаліся ля дрэва. Побач з імі стаяў старшыня сельсовета Канапелька. Разгневаная Юлія Андрэеўна строга загадала вучням не пакідаць работы, а сама, накінуўшы на плечы хустку, шпарка выйшла з класа.

— Таварыш Канапелька, — абурана прамовіла яна, падышоўшы да пільшчыкаў, — вы другі раз зрываеце ўрок...

— Выбачайце, Юлія Андрэеўна, — загаварыў, не гледзячы на яе, Канапелька. — Выбачайце і даруйце... Урок вам не зрываю, заняткам не перашкаджаю, працуйце на здароўечка...

Ён зняў шапку і, бліснуўшы лысінай, пакланіўся Юліі Андрэеўне. Юлія Андрэеўна ўспыхнула.

— Я не дазваляю!.. — ускліннула яна, падступіўшы да пільшчыкаў. Заразжа пакіньце пілаваць!

Пільшчыкі спынілі шоргаць пілой, але не падняліся, нават не разагнулі спін, каб зірнуць на Юлію Андрэеўну.

— Вы не маеце права... — прамовіў Канапелька, і куцыя рыжыя вусікі яго заварушыліся, што заўсёды бывала з ім, калі яму супярэчылі.

— Участак школьны... — тлумачыла Юлія Андрэеўна.

— А школа на тэрыторыі сельсовета.

— Вы не адказваеце за школьную маемасць...

— Я адказваю за ўвесь сельсовет...

Праходзіўшыя па дарозе людзі, пачуўшы шумную гутарку, з цікавасцю падыходзілі да іх і ўслухоўваліся. Стары Мікуша, пчаляр рупіцкі, разабраўшы, у чым справа, падышоў да Канапелькі і, узяўшы за борт парыжэўшага піджака, сказаў:

— Скажу я табе, таварыш Канапелька... Ліпы стаялі, калі я быў от такі... — ён паказаў рукой ніжэй калена. — І будуць стаяць, калі буду там... — ён паказаў пальцам на зямлю. — Стаялі, людзей радавалі, пчол прываньвалі... Скажу, таварыш Канапелька, што гэта не палюдску... От!

— Праўду Мікуша кажа... — падтрымалі людзі.

— Праўду?—са злосцю перапытаў Канапелька, зірнуўшы на натоўп. — Вока радуюць ліпкі? Пчолак падманьваюць? Здзяцінелі, скажу вам! Здзяцінелі на старасці... Ну, каму карысці з гэтых ліп? Каму яны патрэбны? Сонца засцяць толькі... Харавство! Лісцікі шалясцяць... От накрыю ліпавай гонтай стайню, і будзе харавство!..

— На гонту асіны ў бары — ўга, колькі! — адказаў з усмешкай Мікуша.

— Туды-ж ехаць трэба, а тут пад бокам... — заўважыў хтосьці.

— А хіба з асіны выйдзе добрая гонта? — абурыўся Канапелька. — Стайню трэба накрыць — вось! — Ён паказаў вялікі кручкаваты палец. Каб на ўвесь сельсовет! Каб завадскога каня не сорам было паставіць! А яны асіну падсоўваюць... Не з усякага дрэва зробіш гонту...

— Што край, то звычай, а што галава, то розум, — кінуў хтосьці з народа.

— Дальбог, клёпкі ў яго нестае! — ускліннуў, махнуўшы рукою, стары Мікуша.

Словы яго пакрыў рогат натоўпу. Збянтэжаны Канапелька кінуўся да старога:

— Ды я!.. ты ведаеш, з кім размаўляеш?!. Пры выкананні службовых абавязкаў...

— Голубе, сокал мой, хіба я пра цябе? — стрымліваючы смех, лагодна перапытаў стары Мікуша.

— Ды ён-жа пра клёпку... — папраўляў хтосьці з натоўпу.

— Пілуйце! — закамандаваў пільшчыкам Канапелька, адступіўшыся ад старога Мікушы.

Пільшчыкі, якія ўсё сядзелі каля ліпы, пакурваючы люлечкі, нехаця ўзяліся за пілу.

— Таварыш Канапелька! — спакойна прамовіла Юлія Андрэеўна, нездаволеная, што спрэчка набыла такую нечаканую вайстрыню. — Можна пазваніць у раён?..

— Ніякіх раёнаў! — гукнуў Канапелька, прабіраючыся скрозь натоўп.

Ён шагаў па дарозе да сельсовета і штосьці гучна гаварыў, пэўна пагражаючы старому Мікушу і Юліі Андрэеўне. Але людзі не слухалі яго. усе былі ўпэўнены, што ліпы будуць стаяць, як стаялі да гэтага; кожную вясну дзяўчаты будуць вадзіць пад імі карагоды, а ўлетку стомленыя прахожыя будуць адпачываць у цені, слухаючы гудзенне пчол і ўдыхаючы пахучае мядовае паветра.

Праз колькі мінут народ разышоўся. Пайшлі і пільшчыкі, раячыся, дзе знайсці падводу, каб паехаць у лес па асіну. Юлія Андрэеўна, радасная за народ, які заступіўся за ліпы, вярнулася ў школу і абвясціла перапынак.

Ліпы сапраўды засталіся стаяць. А ўвосень, калі былі перавыбары, старшынёю сельсовета замест Канапелькі выбралі маладога хлопца з суседняй вёскі, які да гэтага працаваў загадчыкам хаты-чытальні. Канапельку не выбралі ў другі раз за дрэнную работу сельсовета, але стары Мікуша і Юлія Андрэеўна былі пераконаны, што пацярпеў ён ад здарэння з ліпамі.

Прыгожыя, высокія, раскідзістыя, яны стаяць на ўзгорку ў Рупічах, радуючы вока яркай зелянінай увесну, вабячы да сябе, нагадваючы людзям маленства, калі яны хлапчукамі і дзяўчынкамі бегалі ў школу і залацістае лісцё шуршала пад іх босымі нагамі.

Красавік, 1941.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

У1870. Мінск, друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць штотыднёва. Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394.